ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена



Дзённік першакурсніцы: усё ў нашых руках!

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 ЛІСТАПАДА 2013 г. СЕРАДА № 213 (27578) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ЗАВАЯВАЦЬ НОВЫЯ РЫНКІ

**Аляксандр Лукашэнка наведаў учора ААТ «Керамін», паведамляе БЕЛТА. Прэзідэнт азнаёміўся з фінансава-вытворчым станам прадпрыемства, працэсам вытворчасці найноўшых узораў прадукцыі, а таксама перспектывамі далейшага развіцця «Кераміна». Кіраўніку дзяржавы расказалі аб выкананні яго даручэнняў па рэканструкцыі прадпрыемства.**

Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу да сярэдзіны 2014 года давесці долю акцый дзяржавы ў ААТ «Керамін» да 80%. «Сёння ў дзяржавы каля 60% акцый — мала, сёй-той недапрацоўвае, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Гэта не мне трэба. Я проста не хачу, каб вы праз некалькі гадоў папракнулі мяне ў тым, што я не бачыў гэтага крадзяжу». Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў свой час ён прыняў рашэнне аб вяртанні гэтага прадпрыемства дзяржаве. «Была спроба прысабечыць прадпрыемства вашымі былымі начальнікамі. Гэта няправільна, так быць не павінна! Гэтае прадпрыемства народнае, яно было створана на сродкі народа і належыць народу», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў выпадку, калі замежны інвестар захоча набыць прадпрыемства, усё будзе праходзіць па ўстаноўленай у дзяржаве працэдуры. Ён таксама дадаў, што парадак прыватызацыі прадпрыемстваў у Беларусі вельмі бюракратычны.

«Хутчэй за ўсё, вас у свой час падманулі. Таму я даручыў Камітэту дзяржкантролю і КДБ разабрацца. Бачым — пачынаюцца парушэнні, таму запатрабавалі вярнуць дзяржаве, — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да працоўнага калектыву ААТ «Керамін». — Мною было прынята рашэнне вярнуць акцыі дзяржаве, але не забіраць іх, а заплаціць па мінімальнай цане».

«З'явіцца жадаючы купіць, прапануе добрую цану — паглядзім, прадаваць ці не, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Але мы ўжо наеліся гэтых прыватнікаў». Аляксандр Лукашэнка нагадаў сітуацыю з мінскай «Камунаркай». Паводле яго слоў, са зменай кіраўніцтва нават у крызісныя часы прадпрыемства працуе з прыбыткам. «Усе прыватнікі глядзяць на сваю кішэню. Калі ты стварыў кампанію з нуля — добра. А калі прыйшоў на гатовае — непарадак. Я не хачу, каб усё было разрабавана», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Сёння попыт на беларускія прадпрыемствы велізарны, вы гэта бачыце. Расія хацела б нешта купіць, як быццам сваіго няма. А чаму? Таму што мы не разбурылі сваё, а некаторыя прадпрыемствы ператкварылі ў квітнеючыя, як той жа «Беларуськалій». Пахадзілі, паглядзелі — хочам. Я кажу: плаціце $32 млрд і хоць цэлае прадпрыемства, хоць частку купляйце. Дорага. Я кажу: да пабачэння. Паспрабавалі іншым шляхам — не атрымалася», — сказаў Прэзідэнт. «Мая задача — абараніць дзяржаву і яе ўласнасць», — падкрэсліў ён.

«Не крыўдуйце на жорсткасць, цяпер час такі. Цяпер усе вакол Беларусі ходзяць, як ваўкі галодныя: дзе б прыхапіць. «Керамін», «Беларуснафта», адзін нафтаперапрацоўчы завод, другі... Ва ўсіх рукі свярбяць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — І сёння цісnuць не таму, што я такі дрэнны, дыктатар, а таму, што не аддаю. Тым не аддаў на Усходзе, на Захадзе не аддаў. А хочацца, і ўзяць хочуць за бесцань. Мы на гэта не згодныя».

Але не толькі аб вытворчых справах канкрэтнага прадпрыемства ішла гаворка. Прэзідэнт гаварыў і пра...

**...неабходнасці навядзення жорсткага парадку на ўсіх прадпрыемствах**

«Чаго на мяне крыўдзіцца? Сказаў — рабіце, — адзначыў Прэзідэнт. — Пакуль вы мяне выбіраеце, дазвольце мне прымаць рашэнні, а вы іх выконвайце».

СТАР. 2




Фота БЕЛТА.

**Каля 1 тыс. навучэнцаў Гомельшчыны прайшлі навучанне ў рэсурсным цэнтры Гомельскага каледжа бытавога абслугоўвання, які быў створаны два гады таму з мэтай навучання будучых спецыялістаў у сферы бытавога абслугоўвання насельніцтва на сучасным высокатэхналагічным абсталяванні. Рэсурсны цэнтр дазволіў сканцэнтраваць у адной навучальнай установе сучаснае высокатэхналагічнае цырульніцкае, раскройнае, швейнае і вязальнае абсталяванне.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алег ТОКУН, начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

***«Паводле аператыўных звестак, на 1 лістапада зарэгістравана беспрацоўе ў краіне захавалася на ўзроўні 0,5% да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва (год таму гэты паказчык быў 0,6%). Галоўная характарыстыка беларускага рынку працы — стабільнасць. Пагаршэння сітуацыі з занятасцю насельніцтва і беспрацоўем у 2013 годзе не чакаецца. У цэлым па рэспубліцы каэфіцыент напружанасці на рынку працы на 1 лістапада складаў 0,3 беспрацоўнага на адну вакансію (год таму было 0,4). Сёлета зніжаецца колькасць зваротаў у службу занятасці па садзейнічанне ў працаўладкаванні, памяншаецца рэгістрацыя беспрацоўных, расце колькасць вакансій».***

ISSN 1990 - 763X

# СВЕДКІ

Сумесны праект Полаччыны і газеты «Звязда»
«Урочышча Пяскі»

**У 1945 годзе надзвычайная камісія па расследаванні злачынстваў фашысцкіх захопнікаў прыйшла да высновы, што падчас акупацыі ў Полацку загінула не менш за 150 тысяч савецкіх грамадзян, з іх толькі ваеннапалонных — больш за 100 тысяч. Колькі з іх знайшлі свой спачын ва ўрочышчы Пяскі, невядома. Згодна з нямецкімі дакументамі — не менш за 38 тысяч. Але гэтая лічба датычыцца толькі вязняў перасыльнага лагера «Дулаг-125». Акрамя іх, у Пясках пахаваны і вязні лагера для грамадзянскага насельніцтва Грамы, і дзвюх полацкіх турмаў — падпольшчыкі і партызаны. Іх колькасць ніхто не падлічваў. Такім чынам, верхняя мяжа колькасці загінулых, якія спачываюць у Пясках, не вядомая нікому. Як не вядомыя і іх прозвішчы, акрамя ста чатырох імёнаў, нанесеных на Сцяну памяці. Большасць з іх назвалі сведкі. Сёння наш аповед пра тых з іх, якія зараз жывуць у Полацку.**

СТАР. 5



Фота Надзеі БУЖАН.

**Зоя Уладзіміраўна МУШЫНСКАЯ пералічыла паўтара мільёна рублёў з уласнай пенсіі на стварэнне мемарыяла «Урочышча Пяскі».**

# «КВАДРАТЫ» Ў МІНСКУ «ПАХУДЗЕЛІ»

## Паводле прагнозаў спецыялістаў, да Новага года сталічная жыллёвая нерухомасць патаннее яшчэ на 2-5%

**Практычна ўсё лета на другасным рынку жылля галоўнага мегаполіса краіны назіраўся ўстойлівы рост сярэдніх цэннікаў прапановы. Нешта падобнае назіралася на рынку і ў верасні, але са значна меншай дынамікай. У першай дэкадзе кастрычніка цэны стабілізаваліся, а потым увогуле адзначылася тэндэнцыя на патаненне. Зрабіць аналіз сітуацыі ў жыллёвай сферы сталіцы карэспандэнту «Звязды» дапамагае наш пастаянны эксперт — кіраўнік агенцтва «БелЦТН», старшыня рады Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ.**

### Прапанова перавышае попыт у разы

У параўнанні з летам рэальная актыўнасць патэнцыяльных пакупнікоў паменшылася ўдвая. Так, у чэрвені і ліпені штомесячная колькасць зарэгістраваных дагавораў куплі-продажу дасягала 1400 здзелак. У кастрычніку такіх здзелак зафіксавана было толькі 700. З чым гэта звязана? Аналітыкі рынку тлумачаць падобную тэндэнцыю адразу некалькімі фактарамі. Па-першае, летам масава «вымываліся» танныя кватэры маленькіх плошчаў, таму сапраўды «смачных» прапаноў засталося значна менш. Па-другое, цэннік на жыллё ў сталіцы за апошні час істотна павялічыўся, а людзей з вялікімі заробкамі больш не стала. Яшчэ адным з фактараў, які ўплывае на актыўнасць кліентаў, з'яўляецца праблема атрымання заёмных грошай. У першай дэкадзе лістапада крэдыты менавіта пад набыццё жылля перасталі выдаваць насельніцтву не толькі дзяржаўныя, але і ўсе камерцыйныя банкі краіны. Сёння ў фінансавым сектары крэдытавання на агульных падставах засталася невялікая лінейка камерцыйных крэдытаў, якія выдаюць толькі пад будаўніцтва жылля.

### Пераломны момант на патаненне?

Ужо з першых дзён кастрычніка ўласнікі «тэрміновых» кватэр (калі жыллё неабходна прадаць даволі хутка) на практыцы заўважылі паніжэнне попыту з боку пакупнікоў. У гэтым выпадку частка такіх прадаўцоў была вымушана знізіць цэннікі на свае апартаменты. У асобных выпадках зніжкі на кватэры дасягалі 2-3 тысяч, а часам і 5-6 тысяч долараў.

СТАР. 3

# Заваяваць новыя рынкі

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра сітуацыю на «Барысаўдрэве». «Няўжо я яшчэ павінен ездзіць і парадак наводзіць?! Года, бачыце, не хапіла, і бегаюць, кажуць: за тыдзень усё зробім. За год не зрабілі, а за тыдзень зробіць! Што гэта значыць? Загубяць там мільёны, мільярды беларускіх рублёў, загоняць у бруд тэхніку і будуць гераічна пераадольваць усё тое, што наварацілі. Гэта хіба нармальна? Так быць не павінна! Тым больш на такім прадпрыемстве», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка прызнаў, што «Барысаўдрэў» быў адсталым прадпрыемствам, аднак дзяржава выдзеліла грошы на яго мадэрнізацыю, а таму неабходна было прыводзіць яго ў належны стан. «Калі табе дзяржава дапамагае і там мабілізаваны людзі — трэба варушыцца. Год таму паставіў задачу. Прыязджаю. Добра, не ўсё зрабілі, галавацяпства, яшчэ нешта. Дык яны ж гэта спрабуюць схаваць! Навошта вы гэта хаваеце? Мне ж дастаткова глянуць і імгненна ўбачыць, куды ісці. Дык навошта вы гэта робіце?».

Прэзідэнт падкрэсліў, што праедзе па ўсіх значных прадпрыемствах, дзе раней даваў дарučэнні. «Не прэзідэнцкая гэта справа, але што рабіць, калі ўрад не працуе? Яны хадзілі і думалі, што пройдзе. Вось гэтага быць не павінна», — падкрэсліў Прэзідэнт. Гаворачы пра Барыса Батуру, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта быў адзін з лепшых губернатараў, аднак даручэнні кіраўніка дзяржавы павінны бездакорна выконвацца.

Звяртаючыся да мэра Мінска Мікалая Ладуцькі, Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу цалкам падрыхтаваць сталіцу да зімы, навесці парадак ва ўсіх раёнах Мінска.

«Вось за заводам калавых цягачоў ужо цэлых некалькі гадоў сметнік. Ні Кабякоў, ні Ладуцька гэтага не бачаць!» — адзначыў Прэзідэнт. «Калі мы сябе цывілізаванымі лічым, калі мы цэнтр Еўропы, трэба быць цывілізаванымі людзьмі. Вось адкуль маё патрабаванне. Замежнікі да нас прыязджаюць: ах, які Мінск прыгожы, як у вас хароша. Дык давайце будзем адпавядаць гэтаму», — дадаў Прэзідэнт.

**...сітуацыі на валютным рынку**

«Мы паставілі перад сабой галоўную задачу — не дапусціць абвалаў. І мы бачым, што сітуацыя стабілізуецца», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Вы бегаеце сёння па абменніках і чакаеце нейкай дэвальвацыі. Проста раю вам: не рабіце гэтага і не чакайце», — сказаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сёння ставіцца задача мадэрнізацыі прадпрыемстваў у тым ліку і для таго, каб вырашыць праблему з валютай. «Вядома, зараз не вельмі добры час для мадэрнізацыі, крызісныя з'явы ў Еўропе, Расіі, іншыя постсавецкія рэспублікі проста абваліліся. З крызісу мы рана ці позна выйдзем, але без мадэрнізацыі будзе складана разгортвацца», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Калі мы адстанем, то не прададзім прадукцыю. Быццам бы грошы трацім немала, але спыняцца нельга, каб потым не адстаць ад суседзяў», — адзначыў Прэзідэнт. Ён дадаў, што прадаваць на традыцыйных рынках становіцца ўсё цяжэй. «Але трэба памятаць адно: як бы ні было складана і цяжка, нам трэба выходзіць на іншыя рынкі. Увесь час нельга маліцца на Расію. Прасела Расія — і мы пачынаем куляцца», — сказаў Прэзідэнт. «Вядома, гэта няпроста. У некага ж трэба адваяваць гэтыя рынкі. Але ў нас такі лёс. Іншага не дадзена», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сёння неабходна хутчэй пераходзіць на выкарыстанне айчыннай сыравіны ў вытворчасці, закупляючы за мяжой толькі тое, чаго няма ў Беларусі. Паводле яго слоў, гэта значна танней і шмат у чым вырашае праблему з валютай.

**...удасканаленні сістэмы найму на працу**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў краіне плануюць дапрацаваць правілы прыёму на работу. «Нам, відаць, трэба вярнуць нешта накшталт характарыстык з папярэдняга месца працы, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Вельмі многія думаюць так: маўляў, Прэзідэнт прымусіць выплаціць заробак, а мы будзем курыць або п'янымі хадзіць на працу. Мы павінны ў бліжэйшы час упарадкаваць сістэму найму на працу, пераходу з аднаго месца працы на іншае», — дадаў Прэзідэнт.

Гаворачы аб кантрактнай сістэме, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што на працягу паўгода ўсе павінны перайсці на такую форму працы. «У нас яшчэ шмат людзей працуе без кантрактаў. Няхай прафсаюзы зоймуцца гэтым пытаннем», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Ва ўсім павінен быць парадак. Так робіць увесь свет», — адзначыў ён.

## ■ Героі першай сусветнай

# ЧАС ПРЫМІРЫЎ УСІХ

**Ва ўсім свеце 11 лістапада ў 11 гадзін раніцы праходзіць агульнанацыянальная хвіліна маўчання. Людзі носяць каля сэрца чырвоныя макі, зробленыя з паперы, як сімвал пралітай крыві. Менавіта ў гэты дзень у 1918 годзе была пастаўлена фінальная кропка ў Першай сусветнай вайне, было падпісана пагадненне аб спыненні агнявых дзеянняў. Сёлета і ў беларускай сталіцы гэты дзень прайшоў пад знакам успамінаў пра мінулыя падзеі: адбылася прэзентацыя кнігі Вячаслава Бандарэнкі «Героі Першай сусветнай».**


Вячаслаў БАНДАРЭНКА падчас аўтографсесіі.

Гэтае выданне ўяўляе сабой 12 нарысаў — кароткіх біяграфій людзей, якія назаўсёды ўпісалі свае імёны ў гісторыю тых часоў. Сярод іх — выдатны палкаводзец і камандзір баявога карабля, сын вялікага князя і просты данскі казак, першы ў Расійскай імперыі лётчык-знішчальнік і сястра міласэрнасці, ваенны святар і бравы гусарскі афіцэр…

Кніга выйшла ў расійскім выдавецтве «Маладая гвардыя» ў прэстыжнай Серыі «ЖЗЛ» — «Жыццё знакамітых людзей» — накладам у 6000 экзэмпляраў. Аднак аўтар адзначае, што наўмысна рабіў яе з беларускім ухілам, бо лёсы многіх герояў, апісаных у кнізе, цесна звязаны з Беларуссю.

Выданне мае выдатную паліграфічную якасць. Яно дапоўнена старымі здымкамі, якія раней нідзе не друкаваліся. Сярод іх, напрыклад, унікальныя фота, зробленыя ў разбураным у 1915 годзе Брэсце. Вячаслаў Бандарэнка адзначае:

— Калі мы згадваем гэтую вайну менавіта ў сувязі з Беларуссю, то не можам не звярнуць увагу на тое, што яна нязмушана ўпісвае гісторыю нашай краіны ў агульнаеўрапейскі і сусветны кантэкст. Бо сярод ваеннаслужачых, якія змагаліся на нашай тэрыторыі, акрамя суайчыннікаў, былі самыя розныя людзі. На баку Рускай арміі тут змагаліся польскія, чэхаславацкія, і латышскія стралкі. Нягледзячы на тое, што Балгарыя аказалася сярод краін-ворагаў, у Рускай арміі былі і балгары. Мала хто ведае, што за нас тады ваявалі французскія лётчыкі… Калі разглядаць праціўнікаў, то Аўстра-Венгерская армія ўяўляла сабой вінегрэт: аўстрыйцы, венгры, харваты, сербы, славенцы, украінцы, немцы… Часта на нашай зямлі разыгрываліся поўныя жаху сцэны, калі з розных бакоў фронту маглі сыходзіцца прадстаўнікі адной нацыі. Але час усіх прымірыў. Сёння ў Беларусі можна знайсці вайсковыя магілы, на якіх побач ляжаць былыя ворагі.

Гэтае выданне можна лічыць невялікай крыхой у даніне памяці, якая нашым загінулым прадзедам не была аддадзена. Героям Першай сусветнай не ўручалі юбілейных медалёў, не выплачвалі спецыяльных пенсій. У памяць аб іх не запальваюць Вечны агонь, і кветкі на Дзень Перамогі ім прыносяць вельмі рэдка. Таму так, у біяграфіях, напісаных па-мастацку цікава і надзвычай праўдзіва, лёсы рэальных герояў вызваляюцца з забыцця.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ, фота аўтара**

## ■ Парламенцкі дзённік

# АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА — НАРОШЧВАННЕ ЭКСПАРТУ

**У ніжняй палаце парламента працягваецца абмеркаванне матэрыялаў па праекце бюджэту на 2014 год. Учора адбылося пашыранае пасяджэнне трох камісій, на якіх дэпутаты абмяркоўвалі разлікі асноўных распрацоўшчыкаў галоўнага фінансавага дакумента краіны.**

## Прычыны памылак

Прагноз на бягучы год меў на ўвазе тэмпы росту валавога ўнутранага прадукту 8,5%, цяпер мы маем 1,1%, а да канца года павінны выйсці на 1,3%.

**Віктар ПІНІГІН, першы намеснік дырэктара Навукова-даследчага эканамічнага інстытута Міністэрства эканомікі Беларусі,** патлумачыў дэпутатам, чаму распрацоўшчыкі прагнозу так значна памыліліся год таму.

— Два працэнтныя пункты ВУП эканоміка Беларусі страціла з-за калійнага крызісу, 2,2% — з-за недапаставак расійскай нафты, яшчэ 0,4% — з-за драннага ўраджаю збожжавых. Памылковымі ў горшы бок аказаліся і прагнозы па тэмпах росту двух асноўных гандлёвых партнёраў нашай краіны — Расіі і Еўрапейскага саюза, што пацягнула звужэнне знешніх рынкаў, — сказаў ён.

Асаблівасцю 2013 года з'яўляецца і 20-працэнтнае падзенне экспарту замест запланаванага высокага росту. Той невялікі прырост ВУП, які маецца, забяспечыла ўнутранае спажыванне. Апошняе тлумачыцца тым, што грашовая маса нарошчвалася з улікам росту ВУП у памеры 8,5%. Да таго ж у краіне надта хутка раслі заробкі (на 20% пры росце прадукцыйнасці працы 2%).

На сёлета таксама прыпалі пікавыя значэнні па выплаце Беларуссю знешняй пазыкі, і гэтая сітуацыя захаваецца ў бліжэйшыя два гады.

## Прагноз на 2014-ы год

Распрацоўшчыкі прагнозу на будучы год настойваюць на тым, каб асноўным вектарам развіцця стала нарошчванне экспарту пры абмежаванні ўнутранага спажывання.

— Хоць імпартаёмістасць беларускага экспарту дасягае 50%, кожны мільён прыросту экспарту дае 500 тысяч прыросту станоўчага сальда знешняга гандлю, чаго нельга сказаць пра ўнутранае спажыванне, — звярнуў увагу парламентарыяў Віктар Пінігін. — Нягледзячы на больш нізкую імпартаёмістасць унутранага спажывання, кожны рубель яго дае 35 капеек дадатковага імпарту. Наша вытворчасць наладжана так, што пры выключна ўнутраным спажыванні непазбежна будзе нарошчваецца імпарт. Таму асноўная задача — нарошчванне экспарту, адпаведна — станоўчага сальда. Гэта дазволіць вырашаць пытанні знешняй пазыкі, створыць магчымасці для далейшага нарошчвання ўнутранага спажывання і імпартазамяшчэння пры вытворчасці айчынных тавараў.

Рост ВУП на 2014 год ацэньваецца ў памеры 3,3%, з іх 3,1% — за кошт росту экспарту. «Мы фактычна сціскаем унутранае спажыванне: спажыванне хатніх гаспадарак, валавыя назапашванні, інвестыцыі, — паведаміў эканаміст. — Мяркуем, што частка сродкаў насельніцтва будзе накіравана не на спажыванне, а на будаўніцтва жылля, у тым ліку малапавярховае».

## Бюджэт — без дэфіцыту

Пра тое, што праект рэспубліканскага бюджэту Беларусі на 2014 год плануецца збалансаваць па даходах і расходах, паведаміў парламентарыям **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення бюджэтнай палітыкі Міністэрства фінансаў Алег СЕЛІВЕРСТАЎ.**

Сярод важнейшых крыніц даходу кансалідаванага бюджэту, якія, як мяркуецца, складзе Br205,1 трлн, ён назваў падатковыя даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці. «Плануецца больш за Br26 трлн з ростам на 10,4 працэнта», — сказаў ён.

Што датычыцца выдаткаў, то на абслугоўванне дзяржаўнага доўгу мяркуецца выдаткаваць Br10 трлн. У 2014 годзе прадугледжваюцца значныя сродкі на аказанне падтрымкі рэальнаму сектару эканомікі. Як і ў папярэднія гады, яны будуць аказвацца ў форме змяншэння ставак па банкаўскіх крэдытах.

## Каго лічыць дармаедам

Вельмі ажыўленую дыскусію выклікала прапанова **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Валянціны ЖУРАЎСКАЙ** папоўніць даходную частку рэспубліканскага бюджэту за кошт асоб, якія не бяруць удзел у фарміраванні бюджэту.

— Цяпер ва ўрадзе разглядаецца пытанне аб устанаўленні падатку для грамадзян, якія не ўдзельнічаюць у фарміраванні даходнай часткі бюджэту шляхам выплаты падаткаў, паколькі нідзе фармальна не працуюць, але карыстаюцца сацыяльнымі даброцямі, якія фінансуюцца з бюджэту, — паведаміла **начальнік галоўнага ўпраўлення фінансавання сацыяльнай сферы і навукі Міністэрства фінансаў Святлана КРЭТАВА.**

Ужо распрацаваны праект адпаведнага ўказа, дзе прапануецца вызначыць штогадовы плацеж у памеры Br2,6 млн. Гэтыя сродкі плануецца накіроўваць на фінансаванне сацыяльнай сферы.

## Прапановы дэпутатаў

— Дэпутаты ў сваёй працы над матэрыяламі па фарміраванні бюджэту на наступны год робяць акцэнт на рацыянальнае і эфектыўнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў, — сказаў журналістам **старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Андрэй НАВУМОВІЧ.** — У нас ёсць практычныя заўвагі па дзяржпраграмах, ёсць прапановы па фарміраванні дарожнага фонду. Трэба таксама прадугледзець павелічэнне артыкула выдаткаў на сельскія Саветы, якія вырашана захаваць.

— Камісія па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў вывучыла матэрыялы, якія рыхтуюцца па законапраекце аб рэспубліканскім бюджэце на 2014 год, і ў цэлым мы згодны з прапановай урада па фарміраванні як даходнай, так і расходнай часткі бюджэту, — дадала **дэпутат Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Наталля ГУЙВІК.** — Важна, што, як і ў папярэднія гады, бюджэт захоўвае сваю акцэнт сацыяльнай сферы і сацыяльную накіраванасць. У поўным аб'ёме прапануецца сфарміраваць і выдаткі для бюджэтных арганізацый, што азначае іх бесперабойную дзейнасць. Вельмі радуе, што ўрад пачуў прапанову дэпутатаў прадугледзець выдаткі на фінансаванне дарожнай гаспадаркі. Дарожным гаспадаркам плануецца выдзеліць амаль удвая больш сродкаў, чым у папярэднія гады, і ў 5 разоў больш — на капітальны рамонт дарог.

Яшчэ адна прапанова датычыцца ўвядзення адказнасці за неэфектыўнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

# СКЛАД БОЕПРЫПАСАЎ

**быў знойдзены на тэрыторыі быхаўскага ўчастка прадпрыемства «Магілёўхлебапрадукт».**

Гэта здарылася падчас земляных работ. Машыніст экскаватара капаў траншэю пад водаправод, калі раптам яго коўш падняў разам з зямлёй з дзясятак іржавых балванак. Праца была спынена, а на месца знаходкі выклікалі праваахоўныя службы. Як паведамілі ў Магілёўскім абласным упраўленні МНС, знойдзена 30 мінамётных мін часоў Вялікай Айчыннай вайны. Але канчатковую лічбу назавуць сапёры в/ч 5523, якія цяпер вядуць работы па іх абясшкоджванні. Па словах старажылаў, боепрыпасы знойдзены якраз там, дзе праходзіла мяжа былога аэрадрома.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Да ведама членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

15 лістапада 2013 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне трэцяй сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

**Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне саветніку-кансультанту аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай маладзёжнай палітыцы Мінайчавай Лідзіі Міхайлаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

Утерянные страховые полисы ЗСАО «БелИнгострах» формы 2РН серии БИ №№ 013127, 013128 считать недействительными. УНП 100219645

ОАО «Белторгстрой» извещает, что 27 ноября 2013 года в 10.00 состоится внеочередное собрание акционеров по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31.
Регистрация — с 9.00. При себе иметь паспорт.
Повестка дня:
— О реорганизации Общества. УНП 100633428

# «КВАДРАТЫ» Ў МІНСКУ «ПАХУДЗЕЛІ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Аднак частка гаспадароў жыллёвай нерухомасці не згаджаліся з існуючай тэндэнцыяй, пасля чаго яны проста здымалі свае аб'екты з продажу. Спецыялісты падлічылі, што на зніжэнне ўласных цэннікаў цяпер згаджаецца толькі каля 10-15 працэнтаў прадаўцоў, а вось астатнія працягваюць трымаць старыя кошты або ўвогуле пакідаюць рынак. На першы погляд, такая стратэгія прадаўцоў павінна звузіць рынак і паменшыць аб'ём прапановы, але гэтага не адбылося... Паводле інфармацыі спадара Прасталупава, сёння на сталічным другасным рынку жылля назіраецца амаль максімальная колькасць прапановы, калі ў адначасовым продажы налічваецца ўжо больш за 6 тысяч кватэр. **Асобныя эксперты рынку ўпэўнены, што і ў лістападзе колькасць прадаўцоў стандартнага жылля будзе толькі павялічвацца. А гэта павінна прывесці да масавага патанення ўжо ўсіх тыпаў жылля.** Праўда, патанненне такое прагназуецца на мінімальным узроўні. Паводле разлікаў аналітычнай групы выдання «Нерухомасць Беларусі», за кастрычнік двухпакаёвыя кватэры патаннелі прыкладна на 2,5 тысячы долараў, або на 3 працэнты. А вось аднапакаёўкі «пахудзелі» толькі недзе на працэнт.



### Аднапакаёўку магчыма адшукаць да 60 тысяч USD

Зусім слабенькія па якасці аднапакаёвыя кватэры на крайніх паверхах старых пяціпавярховых дамоў прапануюцца за 54-58 тысяч долараў. Часам невялікія аднапакаёвыя жылыя памяшканні плошчай да 34 квадратных метраў прапануюцца па кошце да 60 тысяч у дзевяціпавярховых дамах. Звычайна кватэры па такім кошце знаходзяцца ў не вельмі экалагічна спрыяльных раёнах горада (Заводскі раён і Шабаны). У астатніх раёнах нават маленькія аднапакаёўкі маюць цэннік не ніжэй за 62-70 тысяч долараў. Менавіта на цэны ў межах ад 65 да 75 тысяч долараў прыпадае самая вялікая колькасць прапаноў аднапакаёвых кватэр.

Мінімальны кошт двухпакаёвых кватэр у Мінску пачынаецца з 62-65 тысяч долараў. Па такім кошце магчыма набыць сапраўды маленькую двухпакаёўку «маласямейку» агульнай плошчай ад 40 да 44 квадратных метраў на крайніх паверхах старых дамоў. Падобныя па якасці кватэры ў спальных раёнах прапануюцца ўжо за 70-72 тысячы долараў. А часам такія двухпакаёвыя «хрушчоўкі» выстаўляюцца на продаж нават па кошце да 78 тысяч. Двухпакаёўкі агульнай плошчай ад 46 да 50 «квадратаў» крыху лепшай якасці ўжо ў дзевяціпавярховых дамах каштуюць да 90 тысяч долараў. Больш-менш прасторныя кватэры плошчай да 60-70 квадратных метраў маюць цэннік ад 90 да 115 тысяч. Сапраўды якаснае двухпакаёвае жыллё ў сучасных дамах ці непасрэдна побач з метро прапануецца ўжо за 150-200 тысяч долараў, а часам і больш.

**Аднак кліентаў на такое дарагое жыллё ў сталіцы ўжо не хапае, таму арганізатары будаўніцтва ўсё часцей вымушаны згаджацца зніжаць кошты.**

Самы малы цэннік на трохпакаёвыя памяшканні выстаўлены на кватэры агульнай плошчай каля 50 квадратных метраў. Падобнае жыллё прапануецца па кошце ад 73 да 85 тысяч долараў. Праўда, такіх танных варыянтаў цяпер на рынку засталося толькі не больш за 10. Стандартныя трохпакаёўкі агульнай плошчай да 70 «квадратаў» каштуюць да 100 тысяч долараў. Трохпакаёўкі ў дзевяціпавярховых дамах спальных раёнаў маюць самы распаўсюджаны цэннік ад 100 да 130 тысяч долараў. Існуюць на рынку шматпакаёўкі па кошце і да 500 тысяч долараў, аднак попыт на іх сёння мінімальны.

### Актывізуецца масавая прыватызацыя кватэр

У свой час у нашай краіне было прыватызавана больш за 90 працэнтаў кватэр у шматпавярховых жылых дамах. Цяпер непрыватызаваным застаецца толькі праблемнае жыллё, якім валодаюць адразу некалькі патэнцыяльных гаспадароў. Гэта былыя муж і жонка, сваякі ці спадчыннікі, якія не змаглі своечасова падзяліць жыллёвую нерухомасць. А вось цяпер пытанні прыватызацыі пачалі вырашацца больш аператыўна, бо ў наступным годзе чакаецца адпаведны ўказ аб пераводзе любога дзяржаўнага жылля ў ранг арэнднага. Менавіта таму сёння ў кадастравым агенцтве шмат работы па афармленні падобных здзелак, калі прыватызуюцца долі жылога памяшкання.

### Таннець пачало і камерцыйнае будаўніцтва

Адсутнасць магчымасці ў насельніцтва карыстацца не вельмі дарагімі крэдытнымі рэсурсамі банкаў прымусіла змяніць сваю цэнавую палітыку і камерцыйных забудоўшчыкаў. На першасным рынку жылля з'явіліся прапановы, па якім квадратны метр агульнай плошчы каштуе ўжо 1350-1400 долараў. Праўда, па такім кошце выстаўляюцца толькі шматпакаёвыя кватэры вялікіх плошчаў. А вось тэрмін здачы дома — у другім квартале наступнага года. Па лініі аднапакаёвых кватэр кошт жыллёвага «квадрата» на такіх умовах складае прыкладна 1500-1550 долараў.

Адзначу, што ў сегменце падобнага долевага будаўніцтва кліентам прапануюцца жыллёвыя метры без адстройвання. Відавочна, што пры такім раскладзе кліенты выбіраюць будаўніцтва новага жылля або толькі крыху даражэйшыя гатовыя кватэры ў жаданым раёне на другасным рынку. Нагадаю, што самы распаўсюджаны цэннік жыллёвага «квадрата» па сістэме долевага будаўніцтва да апошняга часу дасягаў 1650-1700 долараў. Аднак кліентаў на такое дарагое жыллё ў сталіцы ўжо не хапае, таму арганізатары будаўніцтва ўсё часцей вымушаны згаджацца зніжаць кошты або выдумляць розныя акцыі аб дзівосным патанненні пэўных катэгорый кватэр.

### Тэндэнцыя — на плаўнае патанненне

Рыэлтары мінскіх агенцтваў канстатуюць, што апошні месяц пакупнікі прыходзяць толькі са сваімі грашыма. Так, Нацбанк увёў абмежаванне на прырост крэдытных партфеляў, таму банкам цікавей сканцэнтравацца на спажывецкіх крэдытах і абслугоўванні прадпрыемстваў. Пры адсутнасці даступных крэдытаў пакупнікі памяншаюць свае апетыты і шукаюць бюджэтныя варыянты і невялікае па плошчы жыллё. Таму сёння мацней за ўсё таннеюць шматпакаёвыя кватэры і ўвогуле жыллё вялікіх плошчаў.

**Абвалу коштаў у бліжэйшы час не варта чакаць. Хутчэй за ўсё, гэта будзе павольнае плаўнае зніжэнне.**

Мікалай Прасталупаў упэўнены, што такая тэндэнцыя захаваецца і надалей. Больш прыкметна пойдуць уніз кошты на элітнае жыллё і на шматпакаёвыя кватэры ў старых панэльках. Разам з тым патэнцыяльныя пакупнікі вырашылі ўзяць перапынак і пачакаць прымальных цэн і вялікай прапановы. Часткова яны маюць рацыю. Уладальнікі квадратных метраў ужо па выніках кастрычніка выставілі кватэр працэнтаў на 20-25 больш, чым у мінулым месяцы. Таму наш эксперт упэўнены, што ў бліжэйшыя некалькі месяцаў цэннікі на жыллё будуць памяншацца, аднак абвалу коштаў у бліжэйшы час не варта чакаць. Хутчэй за ўсё, гэта будзе павольнае плаўнае зніжэнне. А калі зазірнуць крыху далей? Тут спадар Прасталупаў лічыць, што мінімум да лета цэны на сталічную жыллёвую нерухомасць павялічвацца ўжо не будуць. Хутчэй за ўсё, чакаецца доўгатэрміновая стабілізацыя ці невялікае патанненне жылля на другасным рынку. Нарэшце памераў патанення ёсць пытанне. Калі кіраўніцтва галіны вырашыць знізіць сабекошт будаўніцтва жылля за кошт адміністрацыйных фактараў, тады гэта адгукнецца на цэнніках і ў сферы гатовага жылля. Становіча на рынак можа паўплываць і масавае будаўніцтва жылых дамоў на новых будпляцоўках. Аднак свабодных участкаў у горада цяпер не хапае, размяркоўваюцца яны выключна на аўкцыёнах. А такі механізм азначае рост выдаткаў на будаўніцтва. Атрымліваецца, што ўсе агучаныя намі фактары ў звязцы не дазволяць коштам на жыллё сур'ёзна паменшыцца...

Таму рыэлтары і спадзяюцца, што рынак жыллёвай нерухомасці проста знаходзіцца на шляху да стабілізацыі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Фінансавы выдатнік

# ЭКАНАМІЧНЫ АРЫЕНЦІР

**Амаль усе сродкі масавай інфармацыі абавязкова рэгулярна паведамляюць аб змяненні ці захаванні значэння такога эканамічнага паказчыка як стаўка рэфінансавання. Зразумела, што гэта робіцца не проста так, а з-за важнасці гэтага паказчыка. Мы сваім чытачам таксама пастаянна даём адпаведную інфармацыю. Аднак на што гэта стаўка ўплывае і што паказвае?**

Стаўка рэфінансавання (па-англійску Federal funds rate) — гэта памер працэнтаў у гадавым вылічэнні, якія трэба выплаціць цэнтральнаму банку краіны за крэдыты, дадзеныя крэдытным арганізацыям (банкам). Праз такія крэдыты забяспечваецца рэгуляванне ліквіднасці (плацежаздольнасці) банкаўскай сістэмы пры недахопе ў крэдытных арганізацый сродкаў для ажыццяўлення крэдытавання кліентаў і выканання прынятых на сябе абавязацельстваў. Паспрабуем растлумачыць гэта ўсё больш проста.

Перш за ўсё, вядома, гэта макраэканамічны паказчык кошту (даступнасці) грошай. Іншымі словамі, стаўка паказвае, наколькі дарагія ці танныя крэдыты могуць даць банкі. Адпаведна могуць змяняцца і стаўкі па дэпазітах. Па стаўцы рэфінансавання цэнтральны банк можа пазычыць грошы камерцыйным банкам. Чым ніжэйшая стаўка, тым больш надзейная фінансавая сітуацыя ў дзяржаве і тым больш даступных грошы. А чым больш даступных грошы, тым больш іх ідзе на інвестыцыі ў эканоміку. У выніку эканоміка расце. Пасля гэтага можа паскорыцца тэмп інфляцыі. Потым цэнтральнаму банку даводзіцца падняць стаўку рэфінансавання. А пры павышанай стаўцы інвестыцыі запавольваюцца. І ўсё пачынаецца нанова.

Акрамя таго, стаўка рэфінансавання — гэта пэўны эканамічны арыенцір. Стаўка, пад якую цэнтрабанк крэдытуе банкі ў розных краінах, працаваць можа па-рознаму. Яна вызначаецца ЦБ на падставе аналізу асноўных макраэканамічных параметраў — ВУП, прагнозу змены ВУП, інфляцыі, прагнозу інфляцыі, ліквіднасці. А вось ужо вызначаная стаўка будзе ўплываць на іншыя паказчыкі. Праз гэта і атрымліваецца, што ў кожнай краіне значэнне стаўкі рэфінансавання рознае.

Варта адзначыць, што пры змене стаўкі рэфінансавання цэнтральны банк заўсёды павінен вытрымліваць разумны баланс інтарэсаў укладчыкаў і крэдытаатрымальнікаў. Узровень працэнтнай стаўкі павінен быць такім, каб, з аднаго боку, захоўваць прываблівасць банкаўскіх дэпазітаў, а з другога — рабіць крэдыты «пад'ёмнымі» для насельніцтва і прадпрыемстваў, арганізацый.

❐❐❐

***Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефоне 8 017 292 38 02.***

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

**ПРЫКЛАДЫ ЗНАЧЭННЯЎ СТАВАК РЭФІНАНСАВАННЯ Ў РОЗНЫХ КРАІНАХ (ПРАЦЭНТАЎ ГАДАВЫХ):**

*Расія — 8,25;*
*Швейцарыя — 0,25;*
*Японія — 0,1;*
*Вялікабрытанія — 0,5;*
*Краіны еўразоны — 0,25;*
*Злучаныя Штаты — 0,25.*


**ПРОДАЕТСЯ СКЛАД**
**1 060 м²**
**г. Гродно,**
**ул. Станция Лососно, 28.**
Рассрочка.
Тел. 8029 195-56-81.
УНП 100080849


**ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в населенных пунктах д. Ляды, д. Скураты, д. Новое Житьё, д. Задомля Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | 13 декабря 2013 года, в 11.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | Продавец и его адрес | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 — площадь 0,1283 га, № 624883005801000151, д. Ляды (ограничение в использовании — охранная зона линии электропередачи; охранная зона сетей и сооружений газоснабжения).<br>Лот № 2 — площадь 0,0927 га, № 624883005801000150, д. Ляды (ограничение в использовании — охранная зона линии электропередачи; охранная зона сетей и сооружений газоснабжения).<br>Лот № 3 — площадь 0,1500 га, № 624883009101000104, д. Скураты (по генплану № 35).<br>Лот № 4 — площадь 0,1400 га, № 624883004601000303, д. Задомля (ограничение в использовании — водоохранная зона водного объекта).<br>Лот № 5 — площадь 0,1500 га (по генплану № 2), № 624883007601000049, д. Новое Житьё, ул. Магистральная |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот № 1 — 70 000 000 рублей<br>Лот № 2 — 60 000 000 рублей<br>Лот № 3 — 60 000 000 рублей<br>Лот № 4 — 60 000 000 рублей<br>Лот № 5 — 25 000 000 рублей |
| 8 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | д. Ляды — подъездные дороги, электричество;<br>д. Скураты — электричество;<br>д. Новое Житьё — электричество;<br>д. Задомля — подъездные дороги, электричество, газ |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка, р/с 3641000000058 ЦБУ 621 г. Смолевичи, филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок»), УНП 600046563 (МФО 153001812) |
| 12 | Порядок предв. ознаком. в натуре с земельными участками | Среда в 9.00 |
| 13 | Прием документов | В рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 13 | Окончательный срок приема документов | 09 декабря 2013 года в 17.00 |
| 14 | Контактные телефоны | 8 01776 44 636, 68 030 |

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечание: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:
1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).
3. Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

# ДОКТАР КІНО

## МАСТАЦТВА ВЫЯЎЛЯЕ ДЫЯГНАЗЫ І ШУКАЕ ЛЕКІ ДЛЯ ПАРАНЕНЫХ ДУШ

**У Мінску паказалі шмат кіно — рознага: дзіцячага, анімацыйнага, дакументальнага і ігравога, якое можа быць вельмі падобным на дакументальнае, таму што надзвычай рэалістычна адлюстроўвае жыццё.**

Апошнія некалькі гадоў фільмы, якія паказваюцца падчас фестывалю ў Мінску, ужо ўдзельнічалі на шмат якіх прэстыжных фестывалях свету класа «А». І мы маем магчымасць глядзець тое, што паказвалася ў Канах ці ў Берліне, напрыклад. Мы можам сёння хутчэй разумець, што ёсць мастацтва кіно на цяперашнім этапе. І чым яно жыве. Таму што кіно не існуе без людзей. І калі аўтар здымае фільм, то таму, што яму хочацца выказацца на нейкую тэму, звярнуць увагу на нейкія з'явы; прааналізаваць, чаму адбываецца менавіта так. Падумаць: а што наогул адбываецца з чалавекам? Пашукаць прычыну: чаму гэта адбываецца? Знайсці, магчыма, адказы, а значыць — выйсце... Гэтаму былі падпарадкаваны два конкурсы ігравога кіно «Лістапада»: асноўны і «Маладосць на маршы».

За апошнія некалькі гадоў мінскі кінафестываль зрабіў ухіл у бок сусветнага фестывальнага руху, паставіўшы высокую планку ў адборы фільмаў. Цяпер мала толькі паходжання фільма з пэўнай краіны альбо рэгіёна. Важна, як зроблены фільм і дзеля чаго. На апошнім — акцэнт асаблівы. Таму што хоць і кажуць, што бывае мастацтва дзеля мастацтва, але мэта любога мастацтва — уздзейнічаць на душу: ці то прыгажосцю, ці то глыбакадумнасцю, ці то праз правакацыю: выклікаць пэўныя пачуцці, каб нешта ўзненавідзець ці палюбіць.

Я палюбіла... Прагледзеўшы за фестывальны тыдзень больш за 20 фільмаў конкурсных праграм, я зразумела, што неверагодна люблю жыццё. І так хочацца даражыць кожнай хвілінай цеплыні, кожным момантам радасці, любой магчымасцю быць карысным іншым!.. Рэакцыя на прагледжанае. Таму што ў цэнтры кожнай з прадстаўленых карцін заўсёды быў чалавек. А гэта значыць, так ці інакш прыходзяць думкі пра сутнасць і сэнс таго, што адбываецца навокал, і тое, як ты ўпісваешся ў існуючую рэчаіснасць.

### Дыягностыка

Рэчаіснасць у XXI стагоддзі жорсткая, паводле кіно. Але ці толькі паводле кіно? Бо яно ж толькі фіксуе і вычляняе нейкія моманты з таго, што перажываюць людзі. А яны становяцца ахвярамі помслівых ці выпадковых забойстваў, як у фільме «**Дотык граху» (рэж. Цзя Чжанкэ)**, калі пазбавіць чалавека жыцця (ці самога сябе) — не ўтварае наогул ніякай праблемы ў свеце, дзе кожны сам за сябе. Яны могуць быць ахвярамі ўласных спакус, пасля чаго злосць на сябе саміх штурхае разабрацца з тымі, хто стаў прычынай сыходу, як у стужцы **«Не да часу» (рэж. Барбара Сарасола-Дэй)**. Яны могуць з усмешкай вяршыць лёсы тых, хто ад іх залежыць, не задумваючыся, што самі акажуцца ў нейкі момант безабаронныя (**«Нямы», рэж. Даніэль і Дыега Вега**). Людзі перастаюць даражыць нават блізкімі, калі іх паглынаюць дзіцячыя крыўды і комплексы, а ў галаве замацоўваецца звышідэя, і тады кіруе злосць, яна прымушае маладога і з выгляду добрага хлопца дрэсіраваць сабаку, які адночы забівае малодшага брацiка-цыгана (**«Мой сабака Кілер» Міры Форнай**). З выгляду добры і разумны школьнік, які імкнецца супрацьстаяць кпінам аднакласнікаў, таксама вырашае змагацца са злом: распраўляецца з хлопцам, які трымае ў страху ўсю школу (**«Урокі гармоніі» Эмара Байгазіна**), а потым і з сябрам, які яго «здае» ў вязніцы... У выніку — менавіта тыя абодва аказваюцца нявінна забітымі, а яго душы наканаваны вечныя пакуты, якія ўжо пачынаюцца... Нездарма героямі шмат якіх фільмаў сталі менавіта маладыя людзі альбо нават дзеці, якія толькі выбіраюць шлях. І ад таго, з якім грузам цяжару (альбо граху) пойдуць яны далей, залежыць шлях усяго чалавецтва: яны вызначаюць яго будучыню. Але ў час спакус так цяжка захаваць



Кадр з фільма «Іда» Паўла Паўлікоўскага.

чысціню неакрэплым душам, якім часта няма на каго абаперціся — як гераіні фільма **«Гэта не я» (рэж. Марыя Саакян)**, якая расце сама па сабе і нейкім цудам пазбягае дотыку граху... У стужцы **«Інтымныя месцы» (рэж. Наташа Мяркулава і Аляксей Чупаў)** за імкненнем героя шукаць сексуальныя задавальненні гучыць сацыяльны дыягназ грамадства, заснаванага на геданізме, суцэльным кульце задавальненняў, адсюль наадварот — толькі боль і пустэча.

За асобнымі гісторыямі, за лакальнымі сітуацыямі, якія бярэцца аналізаваць мастацтва, стаяць нейкія прычыны і хваробы, уласцівыя пэўным групам людзей ці наогул грамадствам. І тады аўтарскі крык ператвараецца ў суцэльны звон, які звоніць па некім, але ці чуюць яго? **«Залатая клетка» (рэж. Дыега Кемада-Дыес)** — фільм, які сёлета меў рэзананс у Канах. Сацыяльна вострая гісторыя пра маладых людзей, якія ідуць у пошуках лепшага жыцця. Ідуць у свет, дзе няма ніякіх правілаў, дзе праз чалавека лёгка пераступіць, дзе так проста прапасці і так складана атрымаць жаданае, нават калі ты некуды прыйшоў. Гісторыя, якіх у сучасным свеце шмат — мы штодня слухаем і чытаем у прэсе жудасныя гісторыі пра гандаль людзьмі, пра страчаныя ў пагоні за заробкамі жыцці, пра эміграцыю будні. Гэтае кіно — нібыта рэальная, дакументальная гісторыя, у якой можа быць наогул нічога не надумана і не нацягнута.

**Наш глядач ведае, якое кіно шукае. Нездарма сёлета на некаторыя сеансы немагчыма было купіць квіткі за некалькі дзён: мы задаём сабе пытанні і шукаем адказы. Шукаем прычыны хвароб і прагнем вызвалення ад іх. Яно можа прыходзіць праз боль: паводле медыцыны. Праз катарсіс: паводле мастацтва.**

Фрагменты з жыцця ў ігравым кіно сёлета ўражвалі сваёй дакументальнасцю, нават часам было адчуванне таго, што гэта насамрэч не фільм на экране, а рэальныя людзі, якія нешта робяць і мітусяцца. Часам наогул уся карціна была заснавана на фіксацыі звычайных побытавых момантаў героя (**«Дзіўная котка» Рамона Цурхера**)... Звышрэалізм у кіно бярэ верх? Але што ж тады застаецца ад мастацтва?

Мастацтва, як адна з гронак гармоніі, здольная лячыць. Але як гэта рабіць, пакуль не пастаўлены правільны (хоць, можа, і жудасны) дыягназ? І калі сёння ў праграме больш фільмаў, накіраваных менавіта на дыягностыку чалавечага свету, то гэта можа быць, хутчэй, характарыстыка самога свету? Аднак перамога ўсё ж на баку гармоніі.

### Тэрапія

Фільмаў было шмат — і кожны па-свойму цікавы і ўражвае. Але асноўнымі прызамі — «золатам», «серабром» і «бронзай» «Лістапада» адзначаны дзве карціны. Не таму, што пашкадавалі. Прычыны ў іншым: у тым, пра што гавораць гэтыя карціны.

Нібыта пра тое ж. Людзі жорсткія і могуць забіваць. Як падчас вайны забілі сям'ю дзяўчыны Іды: паляк забіў яўрэяў, якія жылі па-суседстве, пасяліўся ў іх доме. Уратавалася адна маленькая дачушка — светленькая была. Вырасцілі і выхавалі яе ў каталіцкім манастыры. Іда рыхтуецца да манаскага жыцця — іншага не ведае. Але даведваецца пра існаванне цёткі, якая і распавядае Ідзе, хто яна такая. Разам яны едуць шукаць магілу бацькоў. Цётка — жанчына пры статусе, эфектная, вольная ў сваіх чалавечых і жаночых жаданнях. Сціплая Іда, шчыльна зашпіленая на ўсе гузікі, закрывае валасы цнатлівай касынкай. Але хто з іх мае больш радаснае жыццё?..

Іда вяртаецца ў манастыр, дзе ёй усё больш зразумела. Але калі справа падыходзіць да пострыгу — ідзе да статуі Хрыста і прызнаецца: «Я не гатовая...» Цётка, стаміўшыся ад мужчын, алкаголю, кідаецца з акна. Іда едзе ў яе кватэру і каштуе таго, цётчынага жыцця: прыгожыя сукенкі і пантофлі ля люстэрка, каньяк у празрыстым келіху, прыгожая музыка, малады чалавек, ноч кахання... Паспытаўшы ўсё гэта, Іда надзявае свой манастырскі строй і вяртаецца туды, адкуль пайшла... Ідзе ўслед за сваёй душой, якая не хоча існаваць ва ўмовах, навязаных кімсьці, якая прагне чысціні і якая цяпер разумее, чаму ёй трэба быць там...

Калі пішуць, што гэта фільм пра яўрэяў падчас Другой сусветнай вайны, то гэта няпраўда. Гэта фільм пра шлях чалавека да самога сябе, пра дараванне, пра барацьбу спакусаў і пакаянне, пра душу, якая вартая вечнага жыцця. І вось тут хацелася б паспрачацца з тымі, хто лічыць, што на «Лістападзе» зашмат праблемнага кіно з сумным зместам. Перамога **«Іды» польскага рэжысёра Паўла Паўлікоўскага** — гэта менавіта працяг плыні духоўнага кіно на «Лістападзе».

Як і выбар глядацкага журы, якое аддало перавагу драме **«Па крузе» Срдана Галубавіча**, якая распавядае вельмі глыбокую і пранікнёную гісторыю даравання. Дараваць забойцам свайго сына, выратаваць параненага сына аднаго з іх, сказаць пра яго: «Гэта мой сын...» Людзі жывуць у жорсткім свеце, дзе часам нельга давяраць нават сваім. Але ў гэтым свеце, калі ўжо няма сіл жыць і немагчыма выжыць, гэта ўдаецца толькі тады, калі можаш дараваць нават самыя жорсткія рэчы. І тады на сэрцы лёгка і светла... І тады не проста хочацца любіць жыццё — хочацца вызваліць уласную душу ад крыўдаў, каб знайсці гармонію са светам і зрабіць палёгку прасторы.

Наш глядач ведае, якое кіно шукае. Нездарма сёлета на некаторыя сеансы немагчыма было купіць квіткі за некалькі дзён: мы задаём сабе пытанні і шукаем адказы. Шукаем прычыны хвароб і прагнем вызвалення ад іх. Яно можа прыходзіць праз боль: паводле медыцыны. Праз катарсіс: паводле мастацтва.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# «ЛІСТАПАД» СТВАРАЕ СВОЙ КУЛЬТУРНЫ АСЯРОДАК

## Разважаем аб праграме міжнароднага ўзроўню і праблемах лакальнага маштабу

**З кожным годам у кінафестывалю «Лістапада» гледачоў большае. За апошнія тры гады (акурат з таго часу, як змянілася фестывальная дырэкцыя і канцэпцыя фестывалю) «Лістапад» паспеў выхаваць свайго гледача. Ён даволі малады альбо сярэдняга ўзросту, дасведчаны, цікаўны, разумны. Словам, Мінскі міжнародны кінафестываль спакваля фарміруе свой культурны асяродак. Праз мастацтва кіно. І гэта насамрэч не можа не радаваць.**

Праграму сёлетняга 20-га кінафестывалю прыезджыя вядомыя расійскія кінакрытыкі і праграмныя дырэктары іншых кінафестываляў назвалі «мацнейшай, чым у Канах». А гэта сапраўды нечага варта. Гэта міжнародны ўзровень. Прэстыж краіны. Развіццё. Нават дзіву даешся, як усяго за тры гады імідж нашага кінафестывалю кардынальна змяніўся. Гэта больш не кінафестываль з правінцыйным менталітэтам, які збірае не самае лепшае кіно з постсавецкай прасторы. Гэта брэнд.

**Народны артыст Літвы Юозас БУДРАЙЦІС**, ад'язджаючы, удакладняў у мяне: «А ваш фестываль ужо класа «А» ці яшчэ не?». Адказваю: яшчэ не. Бо клас «А» падразумявае «права першай ночы», выключна прэм'ерныя паказы. І да класа «А» адносяцца, напрыклад, Канскі, Берлінскі, Венецыянскі, Маскоўскі кінафестывалі. Мінскі «Лістапад» за прэм'ерамі пакуль не гоніцца, а збірае найлепшае кіно з усяго свету за год. Гэта карціны, якія паказвалі ў тых жа Канах. І беларускі глядач шчаслівы: хоць у Каны паехаць не можа, а вось «канскае» кіно на вялікім экране ў Мінску паглядзець цяпер магчымасць мае. І вельмі прыемна, што сам Юозас Будрайціс ужо разважае пра «Лістапад», карыстаючыся такімі катэгорыямі якасці.



Фота Валерыя АЎСЕЕВАЙ.

Але міжнародны ўзровень кінафестывалю — гэта не толькі добрая трэндавая праграма. Гэта яшчэ і максімальная арганізацыйная дасканаласць. А яна немагчыма без падтрымкі і спрыяння тых, хто з'яўляецца заснавальнікам фестывалю і хто яго фінансуе. Гэта Міністэрства культуры, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт і Белтэлерадыёкампанія.

Менавіта гэтыя структуры павінны ўсяляк падтрымліваць кінафестываль, калі, вядома ж, яны зацікаўлены ў павышэнні прэстыжу краіны, у міжнародным статусе кінафестывалю «Лістапад». Падтрымліваць — гэта значыць быць гатовымі запрашаць замежных гасцей: рэжысёраў, прадзюсараў, акцёраў і, што вельмі важна, замежныя медыя. Бо толькі калі пра беларускі фестываль будуць пісаць за мяжой, калі людзі з-за мяжы будуць імкнуцца на яго патрапіць, толькі тады фестываль будзе развівацца, расці і зарабляць міжнародную рэпутацыю. Ну, а на ўсё гэта, вядома, патрэбны грошы.

З правядзеннем фестывалю непасрэдна звязаны і яшчэ больш матэрыяльныя рэчы. Напрыклад, праблема пляцовак сёлета адчувалася як ніколі. Таму што, як ужо было адзначана, гледачоў у фестывалю з кожным годам усё больш. А гэта сапраўды дасягненне. Як адзначаюць тыя, хто разам з фестывалем з самага пачатку, калі раней на паказы фэсту трэба было ледзь не сілай збіраць гледачоў, то сёння ў залы не прабіцца, квіткі на паказы многіх конкурсных фільмаў былі раскуплены задоўга да пачатку фестывалю. Ды я і сама памятаю, як яшчэ гадоў гэтак 5-6 таму на фестывальных паказах у кінатэатр «Дом кіно» арганізавана прыводзілі вайскоўцаў, каб рэжысёр не прадстаўляў свой фільм перад напаўпустой залай. Цяпер жа сітуацыя абсалютна іншая. І паўстала нарэшце пытанне пашырэння фестывальных пляцовак.

— Падчас кінафестывалю «Лістапад» запаўняльнасць залы большая за 50%. А на вячэрнія паказы — нават большая за 100% — распавядае **Алена АЎДАШЧАНКА, дырэктар кінатэатра «Цэнтральны»**, асноўнай пляцоўкі паказу конкурсных фестывальных фільмаў. — Падчас «Лістапада» мы нават пускаем прэсу і гледачоў, якія не змаглі купіць квіткі (як правіла, гэта студэнты), на прыстаўныя крэслы. Таму што ахвотнікаў трапіць на сеансы больш, чым месцаў у нашай зале.

Зала павышанай камфортнасці кінатэатра «Цэнтральны» сапраўды мае менш за 150 месцаў. І нават пры вялікім жаданні арганізатараў фестывалю змясціць туды ўсіх ахвочых паглядзець пэўны канкрэтны «аншлагавы» фільм немагчыма чыста фізічна. У сувязі з гэтым сёлета сістэму праходу журналістаў на вячэрнія (не для прэсы) паказы зрабілі больш строгай. Таму было шмат пакрыўджаных і абураных. Але тут трэба разумець, што фестывальная дырэкцыя, якая адбірае цудоўныя фільмы ў конкурсныя праграмы, запрашае найцікавейшых гасцей, займаецца арганізацыяй майстар-класаў і творчых сустрэч, не мае магчымасці непасрэдна паўплываць на сітуацыю. Тут павінен падтрымаць горад (у прыватнасці, прадпрыемства «Кінавідэапракат» Мінгарвыканкама), у распараджэнні якога знаходзяцца ўсе сталічныя кінатэатры.

Толькі вылучаць фестывалю ў якасці галоўнай пляцоўкі кінатэатр з залай у 500-600 месцаў таксама не выйсце. Бо арыентаванасць у «Лістапада» іншая: масавыя амерыканскія блакбастары і расійскія камедыі там паказваць не будуць, іх можна паглядзець і па-за межамі фестывалю. Тут патрэбна мудрае рашэнне ў выглядзе сучаснага шматзальніка. Напрыклад, кінатэатр «Беларусь». Там ёсць некалькі даволі кампактных залаў. І кінатэатру не стратна, і здымачнай групе, якая прыехала прадстаўляць фільм, не крыўдна, і ўсе змесцяцца.

У час, калі «Лістапад» выходзіць на якасна новы ўзровень, плённае ўзаемадзеянне з уладамі горада вельмі важнае. Калі будуць створаны ўмовы для таго, каб дырэкцыя фестывалю магла працаваць над ім круглы год, а не ў апошнія некалькі месяцаў перад пачаткам, калі праблема пляцовак будзе вырашана, калі чыноўнікі будуць давяраць людзям з добрым кінематаграфічным густам і досведам, мы будзем ганарыцца «Лістападам» яшчэ больш. А гэта вялікі плюс для іміджу ўсёй краіны, над якім мы ўсе разам працуем, ці не так?

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

13 ЛІСТАПАДА 2013 г.
СЕРАДА
№ 23 (15732)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

# «НА СЦЭНЕ НЕ ХАПАЕ «ГАМЛЕТА НАШАГА ЧАСУ»



Фота Тараса ШЧЫРАГА.

**Калі я малым з бацькамі наведваў тэатр, заўжды адзначаў акцёраў, якія на працягу ўсяго спектакля трымаць у аняменні зачараванага гледача. Мудры, дарослы, басавіты, абавязкова вусаты — чамусьці менавіта такім у маім дзіцячым уяўленні быў сапраўдны акцёр. Толькі пасля я адчуў, што тэатрам рухае не толькі досвед, але і эмацыянальная, таленавітая моладзь. І ўдвая прыемна, што, напрыклад, у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, дзе шчыруе непаўторная Таццяна Мархель, моладзі даюць дарогу. Адно з такіх «палымяных тэатральных сэрцаў» — Дзмітрый ДАВІДОВІЧ, выпускнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, за плячыма якога ўжо з дзясятак роляў на вялікай сцэне. У інтэрв'ю «Чырвонцы» Дзмітрый распавёў не толькі пра сцэнічны дэбют, здымкі ў рэкламе, але і пра размеркаванне, бліны з перцам і здрадлівыя штаны, якія нечакана парваліся падчас спектакля.**

**ДАВЕДКА**

**Дзмітрый ДАВІДОВІЧ нарадзіўся 6 снежня 1988 года ў Жодзіне. У 2012 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «арганізатар тэатральнай дзейнасці, рэжысёр». Іграе на сцэне ў спектаклях «Раскіданае гняздо», «Тры Жызэлі», «Адвечная песня», «Стойкі алавяны салдацік», «Бегчы з Эльсінора, або Гамлет навыварат» і інш.**

❑ ❑ ❑

— На гэтым тыдні ў мяне восем спектакляў, — размова з Дзмітрыем адбылася падчас школьных вакацый. — Каб быць у добрай форме перад выхадам на сцэну, трэба яшчэ распецца, растанцавацца і быць на месцы а 10 гадзіне — за гадзіну да спектакля. Колькі часу праводжу ў тэатры? Усё залежыць ад праекта. Прыходзілася, акрамя асноўнай працы, дапамагаць бутафорам, бо яны проста фізічна не паспяваюць усё зрабіць. І гэта, дарэчы, не прыгоннае права: усё робіцца па ўласным жаданні.

❑ ❑ ❑

— Я добра памятаю сваю першую ролю. Яна была самай лепшай у маім выкананні! На ранішніку ў дзіцячым садку я калісьці выконваў ролю воўка ў казцы «Воўк і сямёра казлянят». А вось маё сталае знаёмства з тэатрам адбылося ў падмаскоўных Мытышчах, куды ездзіў з дэлегацыяй на Міжнародны моладзевы фестываль. Мы глядзелі нейкую камедыю, у якой было пяць дзейных асоб, а ролі выконвалі толькі двое акцёраў. Уцяміў гэта толькі напрыканцы спектакля. Пасля пастаноўкі ўся зала ўзнялася з месца і дружнымі апладысментамі дзякавала акцёрам. Я быў узрушаны падобным.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

*Дзённік першакурсніцы*

# УСЁ — У НАШЫХ РУКАХ!

## 1/09/2013

**Самы лепшы дзень, я яго не прапушчу! 1 верасня Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт сустракаў першакурснікаў. У Мінскім кафедральным Свята-Духавым саборы адбыўся малебен, прысвечаны пачатку навучальнага года.**

І вось мы ўсе накіраваліся да парку Dreamland. Першае, што кінулася ў вочы, калі выйшлі з аўтобуса, — чарга ў парк. Па ёй можна было меркаваць, колькі маладых людзей сёлета паступілі ў галоўную ВНУ краіны: тысячы студэнтаў сталі ў чаканні...

Свята «Віват, студэнт!» засталося ў памяці кожнага. Абыякавых не было. Студэнты ўмеюць весяліцца. Быць часткай галоўнага ўніверсітэта краіны вельмі адказна, але адначасова і вельмі прэстыжна. Я люблю БДУ!



Першая пара...

## 2/09/2013

Усё толькі ў нашых руках. Гэта сутнасць размовы з дэканам факультэта ў вельмі скарочаным варыянце. Потым нас чакалі ўводныя пары. Было займальна. Шмат першакурснікаў — пад вялікім уражаннем. Сёння дзве новыя спецыяльнасці ў Інстытуце журналістыкі адкрывалі міністр адукацыі і віцэ-прэм'ер Беларусі. Адзначаю перавагі вядучай ВНУ краіны з першых дзён.

Інтэрнат. Усё ніяк не звыкнуся з думкай, што я ўжо студэнтка. У наш пакой прыходзіць шмат людзей. К вечару нават крыху надакучвае, але што ж рабіць — інтэрнат...

## 3/09/2013

Першы сур'ёзны дзень з заняткамі. Чатыры пары — зусім не шмат насамрэч. Цікава назіраць за іншымі першакурснікамі, якія паступілі адразу пасля школы. Іх эмоцыі і пачуцці мне вельмі знаёмыя. Гляджу на суседзяў і бачу ў іх сябе. «Ты так хутка запісваеш!» — здзіўляюцца. Лекцыі падаюцца няцяжкімі і зразумелымі. Праблема толькі ў тым, што за апошнюю ноч я не выспалася. У гэтым вінавачу толькі сябе.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

*Маладыя — юным*

# «СВЕЖЫ ВЕЦЕР» ЖУРНАЛІСЦКАЙ ПРАФЕСІІ

**У Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» праходзіла змена «Зубраняцкі карпункт», удзельнікамі якой сталі юныя журналісты з усёй Беларусі. Карэспандэнт «Чырвонкі» стаў непасрэдным удзельнікам усіх мерапрыемстваў, што праводзіліся ў лагеры.**

Галоўнай дзеяй усёй змены быў фестываль дзіцячых СМІ пад назвай «Свежы вецер», што праводзіцца пад эгідай Міністэрства адукацыі. Удзельнікамі форуму сталі школьнікі, якія ў сваіх установах адукацыі выпусцілі лепшыя, па меркаванні журы, газеты, часопісы, радыё- і тэлеперадачы. Усяго на змену трапіла 326 юнкараў, але ў лагеры не ўтойвалі таго факта, што не ўсе дзеці мелі журналісцкі досвед: нехта паехаў «на замену» іншаму, нехта меў вельмі апасродкаваныя адносіны да школьных СМІ. Аднак нават гэтыя людзі не маглі не змяніць сваё стаўленне да журналісцкага рамяства пасля заканчэння «Свежага ветру».

Прынцып змены быў вельмі просты: кандыдаты на перамогу ў конкурсе «Свежы вецер» працуюць у трох рэдакцыях (кожная ў сваім корпусе) і зарабляюць своеасаблівую мясцовую валюту — «зубрыкі». Пасля здачы матэрыялаў, праграм і ўдзелу ў конкурсах віртуальны кашалёк каманды ці канкрэтнага ўдзельніка папаўняецца. У канцы змены арганізатары падлічваюць усе дасягненні каманд, параўноўваюць іх з адзнакамі, якія паставілі дзецям за іх працу ў школьных СМІ, і вылучаюць пераможцаў у кожнай з наступных намінацый: «Лепшая газета», «Лепшы рэпартаж», «Лепшы артыкул», «Лепшы фотарэпартаж», «Лепшая рубрыка», «Лепшы інфармацыйны матэрыял», «Лепшая літаратурная работа», «Лепшае інтэрв'ю», «Лепшы дызайн». А самая лепшая каманда ва ўсіх намінацыях атрымлівае галоўны прыз — Крыштальнага Зубра.



Аўтар і куратар змены Таццяна ШВАЙКО.

**Гаворыць аўтар і куратар змены, метадыст НДЦ «Зубраня» Таццяна ШВАЙКО.**

— Цікавасць у мяне да сферы журналістыкі велізарная, таму што сама часта ўдзельнічала ў падобных конкурсах, ды і ніколі не скардзілася на сваё творчыя здольнасці. Але ў выніку лепшымі «карэктарамі» нашай задумы становяцца самі дзеці, якія прыязджаюць і даюць магчымасць нам зразумець, што добра, а што не. Па выніках змены праект яшчэ раз карэктуецца, і толькі потым мы можам дзяліцца ім з усімі педагогамі краіны.

Недахоп журналісцкай адукацыі ў арганізатараў быў з лішкам кампенсаваны праз запрашэнне гасцей — журналістаў-практыкаў. Серыю майстар-класаў для дзяцей правяла **Таццяна ГУЛЕВІЧ, рэдактар канала «Культура» Беларускага радыё:**

— Мне здаецца, што вось гэтая змена ў «Зубраняці» — вельмі добрая стартавая пляцоўка для абітурыентаў Інстытута журналістыкі. Большасць з дзяцей, што прыходзілі да мяне на майстар-класы, хоць зараз гатова «ісці ў бой». Вялікую колькасць журналісцкіх пачуццяў яны ўжо ведаюць, чулі пра прамы эфір, пра запіс. Працуючы, дзеці сапраўды здольныя выконваць журналісцкую працу, нягледзячы на адсутнасць адпаведнай адукацыі.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
13 11 2013 г.

*Педагагічны «экстрым»*

# ЗНАЙСЦІ СЯБЕ — «ЛЯ САМАГА ЧОРНАГА МОРА»

**Каб трапіць летам на мора, у студэнтаў варыянтаў няшмат. Першы — сумяшчаць вучобу і працу і адкладваць на паездку грошы ўвесь навучальны год. Другі варыянт — узяць грошы ў бацькоў. Ёсць і трэці варыянт, пра які, магчыма, яшчэ не ўсе студэнты ведаюць: на мора можна адправіцца, каб не без прыгод, і тым больш не без карысці правесці час у аздараўленчым летніку. Так, як гэта робяць удзельнікі зводнага педагагічнага атрада «Белая Русь». Але ці ёсць шансы стаць важатым у студэнтаў непедагагічных спецыяльнасцяў?**



— Два гады таму ў Мінску быў запушчаны новы праект, так бы мовіць, эксклюзіўнага зместу, — расказвае **дырэктар гімназіі-каледжа імя І. В. Ахрэмчыка Міхаіл ПАЗНІКАЎ.** — Традыцыйна перавага пры адборы кандыдатаў на работу ў аздараўленчым летніку аддавалася педагогам з вопытам работы або студэнтам педагагічных спецыяльнасцяў. А ў будучага інжынера або юрыста шанцаў прымераць на сабе ролю важатага не было. Без папярэдняй падрыхтоўкі, так бы мовіць, чалавека з вуліцы ніхто да дзяцей не дапусціць.

**«Эксклюзіўнасць» педагагічнага атрада «Белая Русь» якраз і заключаецца ў тым, што стаць важатымі або кіраўнікамі гурткоў могуць студэнты любых ВНУ.** Праўда, пры адной умове — пасля праходжання спецпадрыхтоўкі і атрымання адпаведнага сертыфіката.

Праект быў запушчаны пры падтрымцы Мінгарвыканкама, Камітэта па адукацыі і Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ. Месцам дыслакацыі педагагічнага атрада стаў Туапсінскі раён, пасёлак Новамаіхайлаўскі, дзе размешчаны дзіцячы санаторна-аздараўленчы цэнтр «Залаты колас». Міхаіл Пазнікаў, працуючы ў Мінскім гарадскім інстытуце развіцця адукацыі, два гады курыраваў гэты праект. Менавіта гарадскі інстытут развіцця адукацыі і стаў той базай, дзе навабранцы праходзілі «баявое хрышчэнне».

Лепшыя педагогі праводзілі для будучых удзельнікаў педагагічнага атрада майстар-класы і семінары-практыкумы і давалі той мінімум ведаў, без якога ў працы з дзецьмі ну ніяк не абысціся. А пасля заканчэння навучання студэнты здавалі залік і атрымлівалі (ці не атрымлівалі) сертыфікаты.

— Падчас заліку студэнтам трэба было, напрыклад, падрыхтаваць тры атрадныя мерапрыемствы за пэўны прамежак часу. Дазвалялася выкарыстоўваць інтэрнэт і іншыя крыніцы. А на заліку тэсціравалі, як будучы важаты будзе паводзіць сябе ў той ці іншай сітуацыі: напрыклад, што ён будзе рабіць, калі дзіця ўцякло; калі ў дзіцячым калектыве ўзнік канфлікт і г. д. Гэта значыць, прапаноўваліся рэальныя педагагічныя сітуацыі, з якімі давядзецца сутыкацца ці не штодня, — тлумачыць Міхаіл Пазнікаў. — Натуральна, што навучыць усяму за пяць дзён падрыхтоўкі фактычна з нуля — нерэальна. Таму навучанне працягвалася штодня і ў лагеры. Кіраўнікамі летніка і яго намеснікамі былі педагогі з вялікім стажам работы. Планёркі з «навабранцамі» маглі доўжыцца і гадзіну, і паўтары, калі даводзілася прагаворваць кожную сітуацыю. Трэба дадаць, што і кантынгент у летніку падабраўся няпросты: дзеці з так званых груп рызыкі з усіх рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі.

Першы занятак быў прысвечаны арганізацыйнаму перыяду. А гэта, між іншым, 3—5 дзён: калі за гэты час важатыя не здолеў сфарміраваць атрад, не выявіў лідара і дзяцей, якія знаходзяцца па-за калектывам, не сфарміраваў актыў, то чакаць далей граматнага ўзаемадзеяння паміж дзецьмі і выхавальнікамі або дзецьмі і важатымі не даводзіцца.

Яшчэ на старце праекта была прыдумана назва атрада — «Белая Русь» — і яго дэвіз «Любить детей, забыть про грусть — цель отряда «Белая Русь». Сярод ахвотных атрымаць першы каштоўны педагагічны вопыт і адным махам адпачыць на чарнаморскім узбярэжжы былі студэнты розных курсаў БНТУ, лінгвістычнага ўніверсітэта, Мінскага інстытута кіравання, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры, БДУ, медыцынскага ўніверсітэта, ну і, безумоўна, педагагічнага ўніверсітэта. Але больш чым на 90% педагагічны атрад складаўся са студэнтаў непедагагічных спецыяльнасцяў. Маладыя людзі «закрывалі» фактычна ўвесь спектр «пасад»: працавалі важатымі, кіраўнікамі гурткоў, спартыўных секцый, фізрукамі, інструктарамі па плаванні, арганізатарамі мерапрыемстваў, дыджэямі.

**Дарога ў абодва бакі ім аплачвалася. Пражыванне і харчаванне таксама былі бясплатныя. Ну а ў якасці прыемнага бонусу — сонца, мора, цудатворнае паветра і заробак у памеры 4—5 тысяч расійскіх рублёў, так бы мовіць, на кішэнныя выдаткі.** Натуральна, што ў будаўнічым атрадзе можна зарабіць нашмат больш, але кожны сам для сябе выбірае, што для яго найбольш цікава: мора, кругласутачны інтэракты з дзецьмі або грошы…

Нягледзячы на цяжкасці, з якімі студэнтам давялося сутыкнуцца ў пачатку сваёй «педагагічнай кар'еры» (асабліва ў першы тыдзень, які ператвараўся для многіх у сапраўдную шокатэрапію), усе яны паспяхова адаптаваліся да сваёй новай ролі. Самы яскравы паказчык — жаданне і саміх дзяцей, і студэнтаў на наступны год зноў вярнуцца ў лагер. Ацэнка працы зводнага педагагічнага атрада была вельмі высокай як з боку бацькоў, так і з боку мясцовай адміністрацыі. А гэта значыць, што такая мадэль можа працаваць і мае права на існаванне.

— На сённяшні дзень такой практыкі — калі б студэнты непедагагічных спецыяльнасцяў працавалі з дзецьмі ў аздараўленчых летніках — у Беларусі няма. Але я ўпэўнены, што альтэрнатыўныя падыходы ў працы з дзецьмі ў аздараўленчых установах павінны ўкараняцца хоць бы па той простай прычыне, што калі да работы ў лагерах самых розных профіляў будуць дапускацца толькі педагогі і студэнты педагагічных спецыяльнасцяў, то мы не зможам запоўніць усе пасады. Да таго ж і педагогі не вельмі ахвотна едуць летам працаваць у лагер, паколькі ў гэтым выпадку ім даводзіцца ахвяраваць уласным водпускам. А ёсць жа яшчэ і школьныя летнікі дзённага знаходжання, да працы ў якіх таксама прыцягваюцца педагогі.

У Міністэрстве адукацыі ўжо таксама прызнаюць, што трэба разгледзець пытанне аб допуску да працы выхавальнікамі і важатымі студэнтаў не толькі педагагічных, але і іншых спецыяльнасцяў з улікам іх падрыхтоўкі да работы з дзецьмі. Ёсць неабходнасць вызначэння статусу валанцёраў, якія працуюць у выхавальна-аздараўленчых установах.

Тым жа, хто пажадае ў наступным аздараўленчым сезоне стаць удзельнікам «альтэрнатыўнага» педагагічнага атрада, можна параіць звяртацца або ў сваё «пярвічкі» БРСМ, або ў Мінскую гарадскую арганізацыю БРСМ. Дарэчы, пярвічныя арганізацыі БРСМ ВНУ таксама аказваюць студэнтам дапамогу ў датэрміновай здачы летняй экзаменацыйнай сесіі або ў пераносе тэрміна выхаду на вучобу, калі размова ідзе пра работу ў летніку ў верасні ці кастрычніку.

Шанцы мае кожны кандыдат. Пажаданыя якасці для важатага — адказнасць, камунікабельнасць,назіральнасць, творчы патэнцыял, здольнасць знаходзіць выйсце з нестандартных сітуацый, уменне сабраць вакол сябе каманду за кароткі час, паставіць перад ёй задачу і прывесці да поспеху.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Фота з афіцыйнага сайта Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ.*

*Не вучобай адзінай*

**Для многіх яблык — гэта не проста сімвал восені, але і сімвал здаровай усмешкі ды і ўвогуле здаровага ладу жыцця. Для праграмістаў яблык, калі прыгадаць кампанію Apple, — гэта яшчэ і сімвал прарыву ў развіцці інфармацыйных тэхналогій. А для студэнтаў БДУІР, дзе рыхтуюць спецыялістаў для IT-сферы, яблык сімвалізуе цяпер і першае, і другое. Днямі тут стартаваў праект «Мой стыль жыцця сёння — маё здароўе і поспех заўтра».**

# НАВУКУ АДОЛЕЕ ТОЛЬКІ ЗДАРОВЫ СТУДЭНТ!

Ініцыятарамі праекта, які праводзіцца ў вышэйшых навучальных установах упершыню, выступілі Мінскі гарадскі цэнтр здароўя і Мінскі гарадскі цэнтр гігіены і эпідэміялогіі. А БДУІР, як трапна заўважыў **галоўны ўрач Мінскага гарадскога цэнтра здароўя Іван ТАРАШКЕВІЧ,** ласкава прадаставіў шыкоўную пляцоўку для «медыцыны «засцерагальнай», якой належыць будучыня».

— Для таго, каб сёння прасоўвацца па службе, аднаго толькі розуму недастаткова. Людзі, якія вядуць здаровы лад жыцця, заўсёды будуць больш запатрабаваны. У салідную кампанію, у першую чаргу, возьмуць чалавека без шкодных звычак, чалавека, які разумее каштоўнасць здароўя. Таму наша задача — змяніць псіхалогію маладых людзей, пераканаць іх у тым, што захаванне ўласнага здароўя — гэта не проста іх права, а абавязак, — падкрэсліў Іван Тарашкевіч. — Чаму мы выбралі БДУІР? Таму што тут навучаюцца самыя «прасунутыя» студэнты, тут працуе самы неабыякавы і прынцыповы рэктарат.

Як паведаміў падчас прэзентацыі праекта **рэктар БДУІР Міхаіл БАТУРА,** у гэтым годзе іх універсітэт першым у краіне цалкам перайшоў на схему навучання 4+2: гэта значыць, чатыры гады навучання на першай ступені і два гады — у магістратуры. Фактычна за чатыры гады студэнты павінны будуць авалодаць тымі ж кампетэнцыямі, што і іх папярэднікі за пяць гадоў навучання. Таму, безумоўна, інтэнсіфікацыя вучэбнага працэсу будзе мець месца, а значыць, трэба думаць як мінімізаваць магчымыя наступствы для здароўя маладых людзей.

## ПЕРШАКУРСНІКІ — ПАД УДАРАМ!

Праект ахопіць 2000 першакурснікаў. Куратар праекта **ўрач-валеолаг Сняжана КАЎРЫГА** сцвярджае, што менавіта гэтая катэгорыя маладых людзей уваходзіць у групу рызыкі: фізіялагічныя і анатамічныя змяненні ў арганізме, высокая псіхаэмацыянальная і разумовая нагрузка, неабходнасць прыстасоўвацца да новых умоў пражывання і навучання, фарміраванне міжасобасных узаемаадносін па-за сям'ёй вядуць да зніжэння імунітэту і сур'ёзных медыцынскіх і сацыяльна-псіхалагічных праблем. Да таго ж менавіта ў асяроддзі першакурснікаў найбольш эфектыўная першасная прафілактыка рознага роду залежнасцяў.

Напярэдадні на базе 33-й студэнцкай паліклінікі г. Мінска была праведзена дыспансерызацыя ўдзельнікаў, якая выявіла неабходнасць стварэння ў рамках праекта груп індывідуальнага кансультавання па масе цела, а таксама прафілактыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў. Ёсць студэнты, якім патрабуецца кансультацыя кардыёлага або іншых «вузкіх» спецыялістаў.

Як сведчаць вынікі дыспансерызацыі, абсалютна здаровых сярод абследаваных першакурснікаў усяго 12,3%. Студэнтаў, якія маюць хранічныя захворванні, — 23,3%. А самую вялікую групу складаюць практычна здаровыя маладыя людзі і студэнты з нязначнымі адхіленнямі ў стане здароўя (64,4%).

**«Самыя «хваравітыя» студэнты навучаюцца ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце, дзе асноўны кантынгент складаюць дзяўчаты. А на апошніх радках у рэйтынгу зваротаў да медыкаў знаходзяцца студэнты Беларускага аграрна-тэхнічнага і Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта».**



На першым месцы ў структуры захваральнасці першакурснікаў БДУІР ідуць захворванні зроку (26,2%). На другім месцы — захворванні косна-мышачнай сістэмы: маюцца на ўвазе парушэнні паставы, скаліёзы (ад першай ступені да выражанай), плоскаступнёвасць (24,6%). А замыкаюць першую тройку захворванні сістэмы кровазвароту (19,7%).

## ГУМАНІТАРЫІ ХВАРЭЮЦЬ ЧАСЦЕЙ

— Задача медыкаў — назіраць студэнтаў не толькі з хранічнымі захворваннямі, але і здаровых і практычна здаровых маладых людзей, — падкрэсліла **галоўны ўрач 33-й паліклінікі Алена ХАРКОВА.** — А ў ідэале нам бы хацелася на момант завяршэння праекта павялічыць групу практычна здаровых.

Між іншым, шматгадовыя назіранні сведчаць, што студэнты-гуманітарыі, асабліва першакурснікі, хварэюць часцей, чым студэнты тэхнічных ВНУ. У першую чаргу гэтая заканамернасць тлумачыцца тым, што пры прыёме ў ВНУ на спецыяльнасці гуманітарнага кірунку медыцынскія абмежаванні па стане здароўя — мінімальныя, менавіта таму на гуманітарных спецыяльнасцях навучаецца больш дзяцей-інвалідаў або маладых людзей з хранічнымі захворваннямі.

Але пры паступленні на тэхнічныя і сельскагаспадарчыя спецыяльнасці спіс медыцынскіх проціпаказанняў намнога шырэйшы. Перашкодай для атрымання прафесіі могуць стаць, напрыклад, захворванні органаў дыхання, сэрца, вачэй і іншыя.

33-я паліклініка кантралюе ў сталіцы здароўе студэнтаў 14 дзяржаўных і 11 недзяржаўных ВНУ. Самыя «хваравітыя» студэнты навучаюцца ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце, дзе асноўны кантынгент складаюць дзяўчаты. А на апошніх радках у рэйтынгу зваротаў да медыкаў знаходзяцца студэнты Беларускага аграрна-тэхнічнага і Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэтаў.

## ПЕЛЬМЕНІ — НЕ СТУДЭНЦКАЯ ЕЖА?

— Даказана, што найбольш прадуктыўнай формай работы з'яўляецца работа ў малых групах. Таму мы будзем арыентавацца на лідараў груп — іх стараст, якія і стануць галоўнымі дзейснымі асобамі ў нашым праекце, — паведаміла Сняжана Каўрыга. — У рамках праекта будзе выкарыстоўвацца форма работы «роўны навучае роўнага». Веды, якія старасты груп будуць атрымліваць ад медыцынскіх работнікаў на спецыяльных занятках, тыя будуць перадаваць сваім аднагрупнікам падчас кураторскіх гадзін. Равеснікі больш давяраюць адно аднаму.

Тэмы будучых заняткаў зацікавілі нават рэктара ўніверсітэта, і Міхаіл Батура паабяцаў, што калі ў яго будзе вольная хвілінка, то ён абавязкова таксама зазірне, каб паслухаць парады ад спецыялістаў. Студэнтам збіраюцца расказваць пра прафілактыку залежнасцяў, інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам, уплыў на здароўе камп'ютара і мабільнага тэлефона, асновы рацыянальнага харчавання. Вось толькі ці знойдуць студэнты ў сабе сілы, каб адмовіцца ад сасісак, каўбасы, пельменяў, чыпсаў і кандытарскіх вырабаў?

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Выратавальны нумар

# ТЭЛЕФОН ДАВЕРУ: КАЛІ МАЎЧАЦЬ УЖО НЕМАГЧЫМА...

**Заўважалі, што раскрываць душу лягчэй перад незнаёмымі людзьмі? Мы здольны расказаць сваю біяграфію выпадковаму знаёмаму, спадарожніку. І наадварот, падзяліцца пачуццямі з блізкім чалавекам бывае не так проста. А раптам не зразумеюць, асудзяць, адвярнуцца?.. Асабліва гэта актуальна для падлеткаў. Хіба раскажаш маці пра першае каханне ці канфлікт у школе? Хіба прызнаешся тату, што яго сын марыць не пра ваенную кар'еру, а пра тэатральныя падмосткі? Ужо пятнаццаць гадоў у Беларусі працуе тэлефон даверу для дзяцей і падлеткаў, створаны менавіта для такіх сітуацый — калі маўчаць ужо немагчыма.**

**Тэлефон даверу для дзяцей і падлеткаў: (8-017) 246-03-03. Працуе кругласутачна. Кансультацыі вядуцца ананімна, пры захаванні поўнай канфідэнцыяльнасці.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### КРЫЗІСНЫ ЎЗРОСТ. ТРЫ ЭТАПЫ

Кансультант тэлефона даверу Наталля адзначае, што яшчэ дзесяць гадоў таму дзеці больш ахвотна звярталіся ў службу псіхалагічнай дапамогі. Сучасныя школьнікі часцей вырашаюць свае праблемы ў інтэрнэце — на розных форумах і сайтах. Таму амаль што палова званкоў цяпер паступае ад бацькоў. Дарослых, зразумела, цікавяць пытанні выхавання. Часцей за ўсё праблемы ўзнікаюць з падлеткамі. Але на тэлефон даверу звяртаюцца і бацькі маленькіх дзетак.

Існуе такое паняцце, як крызісны ўзрост. Першы падобны этап дзеці праходзяць у тры гады. Капрызы, істэрыкі, пратэсты — усё гэта суправаджае зараджэнне ўласнага «Я», станаўленне асобы. Наступны этап — калі дзеці ідуць у школу.

«Дашкольнай псіхалогіі сёння надаецца шмат увагі, — расказвае Наталля. — Трэба разумець, што змена гульнявой дзейнасці на вучэбную — гэта сур'ёзны стрэс для дзіцяці. Яго трэба падрыхтаваць да новай сацыяльнай ролі. Бацькі тэлефануюць, каб параіцца, з якога ўзросту лепш аддаваць сына ці дачку ў школу і як навучыць яго падпарадкоўвацца пэўнаму рэжыму, парадку».

Але самы складаны ўзрост — 12-17 гадоў, калі падлеткаў пачынаюць цікавіць экзістэнцыяльныя пытанні: «Хто я?», «Дзеля чаго жыву?», «Што мяне чакае далей?». Спектр бацькоўскіх трывог вельмі шырокі — ад праблем ва ўзаемаразуменні да падазронных скачкоў у настроі сына ці дачкі.

Час ад часу тэлефануюць дарослыя, якія потым перадаюць трубку дзецям. Але, па словах Наталлі, гэта не зусім карэктная сітуацыя. «Запыт павінен зыходзіць ад абанента. Добраахвотнасць — гэта адзін з базавых прынцыпаў тэлефона даверу. А перадача трубкі мае на ўвазе пэўны ціск. У падобнай сітуацыі псіхолаг і дзіця — вымушаныя суразмоўцы. І размова наўрад ці атрымаецца эфектыўнай. Лепш расказаць сыну ці дачцэ пра магчымасць набраць нумар тэлефона даверу і сумесна са спецыялістам паспрабаваць вырашыць тую ці іншую праблему».

**Патэлефанаваў шасцігадовы хлопчык, у якога памёр хамячок. У такім узросце смерць хатняга гадаванца прыраўноўваецца да страты блізкага чалавека.**

### НЕСУР'ЁЗНЫХ ПРАБЛЕМ НЕ ІСНУЕ!

Часцей за ўсё «недарослым» абанентам тэлефона даверу ад 11 да 18 гадоў. Большая палова тых, хто патэлефанаваў, спакойна і разважліва абмяркоўвае свае праблемы, а некаторыя тэлефануюць на мяжы істэрыкі з суіцыдальнымі думкамі. Тады галоўная задача кансультанта — не вырашыць праблемную сітуацыю, а палепшыць эмацыянальны стан падлетка. Наталля прызнаецца, што сутыкалася з падобнымі званкамі: «Такія размовы вельмі складаныя, і могуць зацягвацца да некалькіх гадзін. І ўсё роўна пасля таго, як кладзеш трубку, няма ўпэўненасці, што з дзіцём будзе ўсё ў парадку».

Кансультаванне па тэлефоне даверу праводзіцца ананімна, званкі не адсочваюцца. Таму паўплываць на сітуацыю, калі жыццё суразмоўцы знаходзіцца ў небяспецы, спецыялісты, на жаль, не могуць. Умяшанне старонніх магчыма толькі з дазволу тых, хто патэлефанаваў.

«Але часцей за ўсё да нас звяртаюцца з лакальнымі праблемамі, — працягвае Наталля. — Напрыклад, дзяўчынка падарыла сяброўцы не тую хустку, і сяброўка пакрыўдзілася. Вось дзяўчынка тэлефануе і пытаецца, як ёй сябе паводзіць, каб не давесці справу да канфлікту. Ці, памятаю, быў у мяне складаны званок, адзін з першых: патэлефанаваў шасцігадовы хлопчык, у якога памёр хамячок. У такім узросце смерць хатняга гадаванца прыраўноўваецца да страты блізкага чалавека. І патлумачыць маленькаму чалавечку, што і пасля гэтага можна і трэба жыць далей, зусім няпроста. Словам, для нас не існуе несур'ёзных праблем».

### ШЧЫРАЯ РАЗМОВА І НІЯКІХ МАНІПУЛЯЦЫЙ

У параўнанні з «кабінетнымі» псіхолагамі, у спецыялістаў тэлефона даверу абмежаваны інструментарый. Яны не бачаць абанента, не маюць магчымасці наладзіць зрокавы кантакт і па знешнім выглядзе ацаніць эмацыянальны стан чалавека. Не выкарыстаеш тут і спецыяльныя прыёмы, элементы арт-тэрапіі — толькі шчырая размова. «Калі ўздымаецца праблема ўзаемаадносін з бацькамі, мы не абмяркоўваем дзеянні маці ці бацькі, а размаўляем пра тое, што адчувае падлетак, — тлумачыць Наталля. — У нас няма задачы расказаць, як трэба рабіць, рэагаваць, мы можам толькі прапанаваць выйсце з праблемнай сітуацыі. І ўжо абанент пагаджаецца ці не пагаджаецца з гэтым. Пераконваць і маніпуляваць мы не маем ніякага права».

Тэлефон даверу працуе кругласутачна. Наталля кажа, што нават у начныя змены тэлефон часам распальваецца ад званкоў. «Душэўную раўнавагу можна страціць і раніцай, і ноччу», — усміхаецца псіхолаг. А вось у зваротах са школьнымі праблемамі (канфлікты з настаўнікамі, страх перад іспытамі і г.д.) можна прасачыць пэўную заканамернасць. Больш за ўсё такіх званкоў паступае ў пачатку навучальнага года, у перыяд адаптацыі, ці, наадварот, напрыканцы, калі на стане школьніка адбіваецца фізічная і псіхалагічная стомленасць. Улетку, калі дзеці раз'язджаюцца па лагерах, часцей тэлефануюць з праблемамі ў стасунках з равеснікамі.

Напрыканцы нашай размовы пытаюся ў Наталлі, ці здараліся выпадкі, калі абанент прасіў паразмаўляць з іншым спецыялістам: «У маёй практыцы такога не было. Наадварот, некаторыя цікавяцца, калі на тэлефоне працуе той ці іншы кансультант, каб у наступны раз «трапіць» менавіта да яго. Гэта, хутчэй, выключэнне з правілаў, але і такое здараецца». А калі такое здараецца, ці не лепшая гэта рэклама тэлефону даверу? Усё ж такі лепш выгаварыцца і паспрабаваць знайсці корань зла, а не чакаць, пакуль гэты самы корань прарасце.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

# «СВЕЖЫ ВЕЦЕР» ЖУРНАЛІСЦКАЙ ПРАФЕСІІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Поруч з важатымі на працягу ўсёй змены працавалі чатыры студэнты Інстытута журналістыкі БДУ, кожны з якіх таксама з'яўляецца практыкуючым журналістам. Тры з іх працавалі з юнкарамі ў трох карпусах — Лазурным, Лясным і Азёрным. І сваю чаргу, аўтар гэтых радкоў па перыяд змены стаў галоўным рэдактарам агульназубраняцкай газеты, супрацоўнікамі якой былі юнкары-фрылансеры з усіх карпусоў адразу.

З самага пачатку працы над газетамі стала зразумела: лагер — гэта сапраўды своеасаблівая маленькая краіна з невычэрпнай колькасцю журналісцкіх тэм. Дзеці пісалі пра ўсё. Інтэрв'ю — у лагеры вялізная колькасць цікавых герояў сярод персаналу; акрамя таго, ледзь не кожны дзень да дзяцей прыязджалі цікавыя госці. Рэпартаж — штодня ў лагеры праводзілася адразу некалькі мерапрыемстваў. Нават для даволі спецыфічных журналісцкіх жанраў, накшталт рэцэнзіі ці фельетона, знаходзячы матэрыял: рэцэнзіі пісаліся паводле сумесна прагледжаных фільмаў, фельетоны ствараліся на падставе смешных выпадкаў у лагеры. У адну з карпусных газет трапіла нават рубрыка «Зубраняцкая палітыка», дзе друкаваліся навіны пра дзейнасць дзіцячага самакіравання.



Юнкары за работай.

**Юнкары засвойвалі праграмы для мантажу і ў тэрмін выпусцілі гатовыя перадачы вельмі высокага ўзроўню. Дайшло нават да высмейвання самых распаўсюджаных штампаў тэлежурналістыкі.**

Падчас працы над газетамі больш за ўсё ўражвала здольнасць юных карэспандэнтаў шукаць і бачыць праблемы. Менавіта крытыка больш за ўсё прыцягвала зубраняцкіх журналістаў. Часам гэта былі сапраўды важныя для лагера матэрыялы — як, напрыклад, фотарэпартаж пра беларускую мову ў лагеры. Два карэспандэнты прайшліся па тэрыторыі цэнтра і сфатаграфавалі ўсе надпісы па-беларуску, якіх аказалася не так шмат. Але часам дзяцей зацягвалі асабістыя праблемы. Найбольш папулярнай тэмай для крытыкі была часовая «канфіскацыя» важатымі мабільных тэлефонаў (па зубраняцкіх законах, у дзяцей па прыездзе збіраюць сотавыя, а раздаюць іх два разы на дзень: на «ціхай гадзіне» і перад адбоем). Дарэчы, якраз адсутнасць мабільнай сувязі і пастаяннага доступу ў інтэрнэт ускладняла працу журналістаў і адначасова рабіла яе больш цікавай.

Але не толькі «друкаваным словам» жылі зубраняцкія юнкары: уласнаручна кожны корпус выпусціў па радыё- і тэлеперадачы. Найбольш складаным момантам тут быў тэхнічны: калі зняць ці запісаць матэрыял дзеці змаглі вельмі хутка, то мантаж заняў у іх ледзь не большую частку падрыхтоўкі. Не без дапамогі сваіх старэйшых калег юнкары засвойвалі праграмы для мантажу і ў тэрмін выпусцілі гатовыя перадачы вельмі высокага ўзроўню. Дайшло нават да высмейвання самых распаўсюджаных штампаў тэлежурналістыкі.

Адной з асноўных мэт змены быў выпуск першага нумара агульназубраняцкай газеты і падрыхтоўка праекта перыядычнага выдання цэнтра. Справа ў тым, што ў лагеры доўгі час не было сваёй газеты, якую б выпускалі дзеці. Для вырашэння праблемы быў праведзены адукацыйны форум, на якім 6 каманд прэзентавалі свае работы на тэмы, што тычыліся ўсіх аспектаў будучага выдання: яго назвы, фармату, структуры...

Вынаходніцтвам змены стаў таксама не зусім журналісцкі конкурс «Буктрэйлер». Сутнасць яго была ў тым, што кожны атрад здымаў невялікі відэаролік па матывах якой-небудзь з кніг. Трэба сказаць, конкурс прайшоў «на ўра»: гледачы шчыра смяяліся і суперажывалі героям ролікаў. Лідарамі, праўда, сталі казкі: менавіта па іх было знята больш за ўсё буктрэйлераў (толькі на «Чырвоны Каптурок» прыйшлося тры работы). Аднак не абышлі ўвагай дзеці і іншыя творы: «Майстра і Маргарыту» Булгакава, «Злачынства і пакаранне» Дастаеўскага, «Маленькага прынца» Экзюперы і нават «Пацалунак перад смерцю» Левіна. На жаль, на кнігі беларускіх аўтараў буктрэйлераў знята не было.

Напрыканцы змены традыцыйна падводзіліся вынікі, у першую чаргу — фестываль «Свежы вецер». Усе лепшыя журналісты змены атрымалі дыпломы ў розных намінацыях, прычым абсалютным пераможцам стала каманда магілёўскай гімназіі №1. Сваімі ўражаннямі ад змены падзялілася яе **ўдзельніца Дзіна МІХАЛАП:**

**Падчас працы над газетамі больш за ўсё ўражвала здольнасць юных карэспандэнтаў шукаць і бачыць праблемы. Менавіта крытыка больш за ўсё прыцягвала зубраняцкіх журналістаў.**

— Нават не ўяўляла, што ўсё так адбудзецца. Было вельмі шмат заданняў, мерапрыемстваў, і я вельмі рада, што мы знайшлі ў сабе сілы паўдзельнічаць ва ўсім. Нам усё вярнулася з ліхвой, і мае ўражанні цяпер цяжка перадаць словамі. Ці не стамілася? Толькі калі гэта выключна творчая стомленасць. Галоўны вынік змены для мяне — я ведаю, што магу і ўмею пісаць журналісцкія тэксты. Пра паступленне на журфак пакуль гаварыць не буду, але, як мінімум, запасны варыянт у мяне цяпер ёсць.

На апошняй сустрэчы, якая адбылася перад ад'ездам, удзельнікі фестывалю дзякавалі метадыстам, важатым і ўсім, хто з імі працаваў. А некалькі дзясяткаў чалавек упэўнена казалі, што з будучай прафесіяй канчаткова вызначыліся. Ці ж не для гэтага і працаваў «Зубраняцкі карпункт»?

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ,**
*Мядзельскі раён.*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
13 11 2013 г.

*Свая партыя*

# БЫЦЬ ПЕРШАЙ У АРКЕСТРЫ ПАД НАЗВАЙ «ЖЫЦЦЁ»

**Скрыпачка Маргарыта Лапінская мае ўзнагароды многіх рэспубліканскіх і міжнародных скрыпічных і вакальных конкурсаў, але працягвае шукаць свой шлях. Адным з нядаўніх яе творчых дасягненняў стаў удзел у амерыканскім вакальным праекце «Supernova Star Search» West Hollywod, дзе Маргарыта стала адной з фіналістак. У размове яна падзялілася найбліжэйшымі планамі, расказала пра сваіх вучняў і ролю музыкі ў жыцці.**



***— Ты стала фіналісткай конкурсу «Supernova Star Search». Як трапіла туды?***

— Пра конкурс даведалася ў інтэрнэце. Убачыла аб'яву, што праводзіцца пошук новых талентаў, і вырашыла паўдзельнічаць. Згодна з умовамі трэба было даслаць арганізатарам запіс выканання песні. Пасля я атрымала водгук, што маё выступленне спадабалася. Сказалі, быццам усё пры мне: і спяваю, і на скрыпцы граю, і знешнасць падыходзіць. Мне далі магчымасць выпрабаваць сябе, прапусціўшы ў паўфінал. Акрамя мяне, туды трапілі яшчэ 30 дзяўчат. Удзельніцы былі з Масквы, Мінска, Кіева, іншых гарадоў. Дзяўчаты былі моцныя канкурэнткамі. Шчыра кажучы, я пачала сумнявацца ў сваіх шансах, калі васьмярых папрасілі выступіць паўторна, бо тыя прэтэндэнткі былі дастаткова яркімі. І калі я праз два тыдні атрымала паведамленне, што трапіла ў лік фіналістак, была ў шоку.

***— Цяпер сярод вас будуць выбіраць самую моцную?***

— Арганізатары спачатку планавалі выбраць дзесяць удзельніц для фіналу, каб потым вызначыць пераможцу. А цяпер яны напісалі, што адабралі пяцёрку ўдзельніц для стварэння новага музычнага гурта.

***— Якімі будуць умовы супрацоўніцтва, ведаеш?***

— Гурт, які збіраюцца стварыць, будзе падобным да Pussicat Dolls.

**Цяпер зацікавілася выкананнем саудтрэкаў. Планую пашырыць свой рэпертуар — сумясціць скрыпку з гімнастычным танцам і вакалам.**

Я прыкладна ўяўляю, што мяне чакае. Трэба будзе сур'ёзна працаваць. Штодзённыя рэпетыцыі, заняткі вакалам і харэаграфіяй. Магчыма, нават знешнасць кожнай з нас будзе зменена. Я ўжо маральна рыхтуюся да кардынальных перамен.

***— Ты гатова ахвяраваць асабістым жыццём дзеля сцэны?***

— Я разумею, што гэта мой шанц нармальна раскруціцца. Я шмат працую і знаходжу ў творчасці задавальненне, аднак не расцэньваю гэта як ахвяру. Проста праца ў прыярытэце.

***— Скажы, іграць на скрыпцы было тваім уласным жаданнем ці рашэннем бацькоў?***

— Калі мне было шэсць гадоў, то я вельмі хацела граць на фартэпіяна. Мы прыйшлі на праслухоўванне ў музычную школу і там, вызначыўшы мой дастаткова добры слых, выкладчыкі параілі бацькам аддаць мяне «на скрыпку». Гэты інструмент быў нават больш выгадным варыянтам для маёй сям'і ў фінансавым плане і месца шмат не патрабаваў. Таму рашэнне было воляй бацькоў, але сёння я ім вельмі за яго ўдзячная. Уцехай мне стала абяцанне, што на другім годзе навучання фартэпіяна ва ўсіх ідзе як дадатковы інструмент.

***— Складана было вучыцца?***

— Сем гадоў навучання не абыходзіліся без слёз. Але я заўсёды любіла даводзіць справу да канца. Калі, напрыклад, мне казалі, што нейкую кампазіцыю трэба выконваць пэўным чынам, а ў мяне так не атрымлівалася, то рабіла ўсё, каб было, як трэба. Вельмі ўдзячна маёй выкладчыцы Святлане Міхайлаўне Пажарыцкай, якая заклала аснову ў маю ігру на скрыпцы. Яна ведала, што я люблю спяваць і танцаваць, займаюся гімнастыкай, і імкнулася падтрымліваць мае інтарэсы. Давала парады, выказвала сваю думку пра мае выступленні. Галоўнае — Святлана Міхайлаўна дала мне разуменне таго, што скрыпка дапамагае развіваць слых, вакал. І цяпер дзякуючы заняткам на скрыпцы я адчуваю музыку. Ігра на інструменце адкрыла ўва мне талент напісання ўласнай музыкі для малога сімфанічнага аркестра.

***— А са сваімі вучнямі якой тактыкі прытрымліваешся?***

— Мае вучні ведаюць, што я артыстка. Для іх мой прыклад з'яўляецца добрым стымулам вучыцца. А калі бачыш, як у дзяцей гараць вочы, то хочацца даць ім самае лепшае. У часы майго навучання даводзілася сустракаць дзяцей, якія займаліся музыкай пад прымусам бацькоў. Сярод сваіх вучняў я такіх не сустракаю. У іх жаданне займацца музыкай нараджае імкненне і ўсё астатняе рабіць таксама добра. Я стараюся падтрымліваць гэта ў кожным.

***— Як прыйшла да сольнай кар'еры на скрыпцы?***

— Безумоўна, пачыналася ўсё з канцэртаў у школе, потым былі поспехі ў музычным каледжы. А з часам пачалі прапаноўваць выступаць на розных святах, мерапрыемствах, у клубах. Я пачала шукаць свой рэпертуар. Акцэнт рабіла не на класіку, а арыентавалася больш на сучасную музыку, бо людзей прываблівюць хуткі рытм і эстраднае гучанне.

**Ствараючы нешта сваё, стараюся не абмяжоўваць сябе жанрава. Мне цікава адкрываць новыя магчымасці скрыпкі.**

***— Наколькі разнастайны рэпертуар сёння?***

